

У ЧЫМ ПРЫЦЯГАЛЬНАСЦЬ СТУДАТРАДАЎСКАГА РУХУ?

ЧЫРВОНКА

СІМВАЛЫ НАВАГОДНЯГА СТАЛА

13



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

23 СНЕЖНЯ 2021 г. ЧАЦВЕР № 248 (29617)

## КОРАТКА

- Базавая стаўка з 1 студзеня вырасце да 8%.
- **Ордэнам Маці ўзнагароджаны 49 жыхарак Віцебскай, Гродзенскай і Магілёўскай абласцей.**
- У перыяд навагодніх і калядных свят у Мінску арганізуюць больш за 200 тэматычных мерапрыемстваў.
- **Каля 14 % арганізацый Беларусі прадугледжвае поўную або частковую аплату бацькаўскага водпуску.**
- «Камунарка» выпусціць больш за мільён навагодніх падарункаў.

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Уладзімір ГУСАКОЎ, старшыня Прэзідыума НАН:**

*«Нацыянальная культура, родная мова — падмурак існавання і далейшага развіцця самасвядомасці народа, яго ідэнтычнасці. Наш народ ганарыцца сваёй багатай матэрыяльнай і духоўнай спадчынай, зберагае яе. Нягледзячы на праяўленне ў сучасным свеце выразна выяўленай тэндэнцыі культурнай універсалізацыі, імкненне нівеліраваць культурную разнастайнасць, каб дагадзіць тым, хто прапагандуе прыхільнасць да стандартаў, якія фарміруюць грамадства спажывання, мы, беларусы, лічым сваім маральным абавязкам і захаваць, і трансліраваць падрастаючаму пакаленню традыцыі нашага народа, духоўныя каштоўнасці нашых продкаў. На гэтай пазіцыі стаіць беларуская дзяржава, яе прытрымліваецца навуковая супольнасць Беларусі і, бясспрэчна, у цэлым беларускі народ».*

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

# «Без губернатараў, без выканкамаў не зможам кіраваць краінай»

## Прэзідэнт у Гомелі прадставіў новага кіраўніка вобласці



Фота БелТА.

**Беларускі лідар правёў у Гомельскім аблвыканкаме нараду з актывам паўднёва-ўсходняга рэгіёна. Прэзідэнт прадставіў новага старшыню аблвыканкама Івана Крупко, які быў прызначаны на пасаду напярэдадні.**

**Прэзідэнт Беларусі ў час сустрэчы з актывам Гомельшчыны падкрэсліў асабліва важную ролю ў сістэме кіравання дзяржавай уладаў на месцах:**

**— Без губернатараў, без выканкамаў не зможам кіраваць краінай. Гэта ключавыя пасады ў нашай дзяржаве. Сем чалавек (кіраўнікі аблвыканкамаў і Мінскага гарвыканкама. — Заўв. рэд.) — яны павінны быць як крэмень.**

**Пры гэтым Аляксандр Лукашэнка ў чарговы раз засяродзіў увагу на адной з важных задач, пастаўленых перад кіраўнікамі рэгіёнаў, — гэта стварэнне і захаванне ў райцэнтрах вытворчых магутнасцяў, забеспячэнне мясцовых жыхароў рабочымі месцамі.**

СТАР. 2

# Аператыўна, зладжана, сістэмна і па-добраму да людзей

*З выступлення Старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Н. І. КАЧАНАВАЙ на закрыцці шостай сесіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь сёмага склікання*



Сітуацыя, якая разгортваецца вакол нашай краіны, вельмі няпростая — антыбеларуская рыторыка ЗША і калектыўнага Захаду ўзмацняе жорсткасць, каля заходніх граніц нарошчваецца ваенная прысутнасць.

Вонкавыя сілы па-ранейшаму строяць планы па знішчэнні беларускай дзяржаўнасці. Дасягненні незалежнай Беларусі — мір і бяспека, народнае адзінства і традыцыйныя каштоўнасці, сацыяльна арыентаваная эканоміка і міралюбівая знешняя палітыка — іх галоўныя мішэні.

Сёння беларусаў імкнуцца падзяліць з любой нагоды — няхай гэта будзе паглыбленне інтэграцыі ў рамках Саюзнай дзяржавы, абнаўленне Канстытуцыі, міграцыйнае пытанне ці ўсё той жа каранавірус. Заходнія паліттэхнолагі не грэбуюць маніпуляваць нават пачуццямі вернікаў.

СТАР. 4

# Законнасць, парадак і дастойны ўзровень жыцця

*З выступлення Старшыні Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь У. П. АНДРЭЙЧАНКІ на закрыцці шостай сесіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь сёмага склікання*



Задачы, якія стаяць перад краінай у Год народнага адзінства, запатрабавалі зладжаных дзеянняў усіх органаў улады па абароне суверэнітэту, базавых каштоўнасцяў беларускага народа і забеспячэнні дастойнага ўзроўню жыцця нашых грамадзян.

Галоўны вынік праведзенай работы ў тым, што нацыянальная эканоміка працягвае расці, прадпрыемствы працуюць у штатным рэжыме, павялічваюцца аб'ёмы беларускага экспарту, а на вуліцах гарадоў законнасць і парадак.

Гэта даказвае эфектыўнасць мер, прынятых кіраўніком дзяржавы па захаванні краіны і прыцягненні ўсіх патрыятычных сіл грамадства да абмеркавання стратэгіі яе развіцця.

Вынікам шырокага грамадскага дыялогу стала выпрацоўка прапаноў па змяненні Канстытуцыі. Для дэпутатаў удзел у іх падрыхтоўцы з'явіўся адным з найбольш важных і адказных кірункаў заканадаўчай дзейнасці.

СТАР. 5



Фота БелТА.

# Настрой — навагодні!

Па ўсёй краіне пачалі працаваць ёлачныя базары. На іх можна не толькі купіць зялёную прыгажуню — наведвальнікаў чакае шмат прыемных сюрпрызаў. Напрыклад, на Смаленскім рынку ў Віцебску можна зрабіць сэлфі з галоўнымі навагоднімі персанажамі.

ISSN 1990 — 763X

# «Без губернатараў, без выканкамаў не зможам кіраваць краінай»

## ВЫТВОРЧЫЯ ІМПУЛЬСЫ

Прэзідэнт падзяліўся, што гэтая ж тэма ўзнімалася напярэдадні падчас яго сустрэчы з сям'ёй касманаўта Алега Навіцкага. Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што за апошнія гады многія раённыя цэнтры былі прыведзены ў парадак, але за работай збольшага забыліся пра стварэнне рабочых месцаў. Прэзідэнт падкрэсліў, што размова менавіта аб невялікіх вытворчасцях. Напрыклад, на 100-120 работнікаў.

— Каб яны былі прывязаныя да гэтага раённага цэнтра. Калі мы з раённых цэнтраў прыбяром такія вось фундаментальныя вытворчасці, работы не будзе, людзі пачнуць з'язджаць. Каб у нас было раўнамернае размяшчэнне прадукцыйных сіл, трэба мець вытворчасці, — падкрэсліў беларускі лідар і адзначыў, што праблема з дэфіцытам рабочых месцаў актуальная не для ўсіх райцэнтраў, але па некалькі такіх у кожнай вобласці ёсць. На прыкладзе Гомельшчыны быў прапанаваны такі варыянт развіцця перспектыўнай вытворчасці ў раёнах як дрэваперапрацоўка.

Галоўны пасыл для жыхароў раёна ад Прэзідэнта: «Уся моц Гомельскай вобласці павінна быць адноўлена»:

— Мы не можам загубіць Гомельскую вобласць, і мы яе не загубім. Гэта выключана. Нават калі ўсе вы адмовіцеся ад гэтай ідэі аднавіць моц гомельскай зямлі, мы пойдзем з іншымі людзьмі. Але мы павінны аднавіць Гомельшчыну. Гэта цудоўны край, і лепшага кутка ў нас няма. Гэта асаблівы край Беларусі, і мы яго абавязкова захаваем.

За значны ўклад у развіццё вобласці кіраўнік дзяржавы падзякаваў папярэдняму старшыні аблвыканкама Генадзю Салаўю:

— Вы, Генадзь Міхайлавіч, як моцны гаспадарнік у пэўнай меры разварушылі мясцовую «вертыкаль». Чалавек увогуле з боку, з Міншчыны, а вельмі блізка да сэрца прынялі праблемы, якія існуюць на Гомельшчыне.

## РЭГІЁН, ШТО НЕ МОЖА БЫЦЬ У «СЕРАДНЯКАХ»

Прэзідэнт пазітыўна ацаніў развіццё Гомельшчыны ў апошнія гады. Як звярнуў увагу кіраўнік дзяржавы, гэты паўднёва-ўсходні край — найбуйнейшы па тэрыторыі рэгіён, дзе сканцэнтравана пятая частка прамысловай вытворчасці краіны. Тут вырабляюцца амаль усе кормаўборачныя і збожжаўборачныя камбайны, мінеральныя фосфарныя ўгнаенні, больш як 95 працэнтаў сталі, амаль палова аўтамабільнага бензіну і дызельнага паліва, тэрмапаліраванага ліставога шкла. Акрамя таго, у рэгіёна выгаднае геаграфічнае становішча і развітая транспартная інфраструктура.

— Але вам больш за ўсіх дасталася ад аварыі на Чарнобыльскай атамнай станцыі. Тады, на світанку майго прэзідэнцтва, я сербануў гэтага гора, перажыў разам з вамі часы бесперспектыўнасці і безнадзейнасці, — нагадаў беларускі лідар. — Сказаць, што мы ўжо ўсе пытанні па Чарнобылі вырашылі, не. Таму мы не адыходзім ад гэтага. У найбліжэйшыя вясну — лета я хачу найважнейшым чынам паглядзець на тыя чарнобыльскія землі, пабываць у тым запаведніку, як мы яго называем, каб зрабіць канчатковыя высновы, якім чынам будзем там працаваць.

Кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу і на тое, наколькі вялікая работа была праведзена ў рэгіёне па аднаўленні зямель пасля аварыі на Чарнобыльскай АЭС. Але, на яго думку, пры той падтрымцы, якая аказваецца пацярпелым раёнам у пытаннях сацыяльна-эканамічнага развіцця, вобласць пакуль не раскрыла свой патэнцыял.

— У рэгіёна няма падстаў быць серадняком па выніках развіцця. А пакуль выглядае гэта менавіта так, калі не горш, — канстатаваў Прэзідэнт.

Кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу, што ў рэальным сектары Гомельскай вобласці, на жаль, за апошнія гады адсутнічае эканамічны рост.

— Гэта пацвярджае і штыль у дзелавой актыўнасці Гомельскай вобласці. Колькасць суб'ектаў гаспадарання застаецца практычна нязменнай — паводле маіх даных, 13,9 тысячы адзінак. Хоць нам жыццёва важна ствараць новыя канкурэнтаздольныя прадпрыемствы і новыя рабочыя месцы, — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Пры гэтым, адзначыў Прэзідэнт, Гомельская вобласць, як і Віцебская, павінна адыходзіць ад залежнасці ад буйных прадпрыемстваў і максімальна дыверсіфікаваць свае пункты росту.

## ЗАКОН І ПАРАДАК

Звяртаючыся да актыву рэгіёна, Прэзідэнт зрабіў акцэнт на дзейнасці сілавых структур у вобласці. Галоўная задача — работа ў цеснай звязцы з мясцовымі ўладамі і ў інтарэсах рэгіёна і краіны ў цэлым. Як падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка, праваахоўныя і следчыя органы, пракуратура, упраўленні КДБ у Беларусі маюць незалежны статус, залежаць толькі ад закона, у іх свая вертыкаль кіравання, а абстаноўка і парадак у рэгіёне — найпершая адказнасць.

— Улічыце: яны ўсе члены выканкама. Я іх зацвярджаю як членаў выканкама. І рашэнні выканкама — закон для ўсіх праваахоўных органаў. Калі вы, даючы ўказанне, парушаеце закон, яны, вядома, неадкладна далажаць міністру, міністр праінфармуе мяне. Праваахоўная сістэма павінна працаваць у Гомелі на рэгіён і на краіну ў цэлым. Я жадаю, каб гэта пачулі людзі ў пагонах і вы гэта ўлічылі, — заклікаў кіраўнік дзяржавы.

Прэзідэнт расказаў аб затрыманні зламыснікаў за спробу ўчыніць тэракты. «Міністр унутраных спраў мне далажыў. Сёння ноччу — учора днём затрымалі 6 ці 7 чалавек, якія спрабавалі ўчыніць тэракты. Некаторыя — мы проста назіралі і чакалі, калі яны пад камеру гэта зробяць. Усё зазнялі. Супраць дзяржаўных служачых, асабліва супраць работнікаў пракуратуры, і нават на суддзяў пакацілі ўжо. Сем чалавек затрымалі. Аднаго шукаем. Знойдзем, здаецца, у Расію пабег. Але там прывязуць нам яго», — сказаў Прэзідэнт.

Кіраўнік дзяржавы таксама выказаўся аб дзеянні праціўнікаў — тых, хто спрабуе распаліць абстаноўку ў краіне: «Мы ведаем, якіх яны хочуць перамен, як яны будуць байкатаваць наш рэферэндум. У іх найважнейшая мэта — улезці ў дзяржаўны апарат. Таму майце гэта на ўвазе. Будзьце акуратныя пры падборы кадраў. Будзьце вельмі акуратныя і асцярожныя. Таму што мы разам з міліцыяй, КДБ і пракуратурай, Следчым камітэтам да гэтага часу выцягваем гэтых мярзотнікаў».

## УТАЙМАВАННЕ ВІРУСА

Яшчэ адна актуальная тэма, узнятая на самым высокім узроўні, — эпідэмічная сітуацыя ў рэгіёне. Як было даведзена Прэзідэнту, захваральнасць на каранавірус у вобласці значна знізілася.

— Мы сёння маем 23 працэнты да ўзроўню гэтай хвалі. Больш за палову жыхароў вобласці прышчапілася першым кампанентам вакцыны ад COVID-19. Тая праблема, з якой мы сутыкнуліся, паказвае нам сёння і рэзервы, на якія варта засяродзіць увагу, — праінфармаваў Прэзідэнта намеснік старшыні Гомельскага аблвыканкама Уладзімір Прывалаў.

У цэлым паказальны беларускі досвед у барацьбе з пандэміяй асабліва адзначыў кіраўнік дзяржавы: Беларусі ўдалося справіцца з гэтым выклікам як ніводнай іншай краіне.

— Асаблівасць нашай сістэмы барацьбы з ковідам заключаецца ў тым, што ў нас вірусолагі і спецыялісты ў гэтай сферы хворых не лечаць. У нас вірусолагі па бальніцах паехалі і навучылі звычайных урачоў лячыць гэтую заразу. Калі б мы зрабілі стаўку толькі на вірусолагаў (а іх жа ў краіне няшмат), мы б ніколі не справіліся з лячэннем. Кажуць, дзякуй урачам за тое, што лечаць. Не: дзякуй урачам за тое, што навучыліся лячыць ковід. Яны за кароткі перыяд часу навучыліся лячыць хворых, — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт прывёў сітуацыі ў заходніх краінах, калі сістэма аховы здароўя не спраўляецца з наплывам хворых, з-за чаго там высокая смяротнасць ад каранавіруса.

* * *

Звяртаючыся да новага старшыні Гомельскага аблвыканкама Івана Крупко, Аляксандр Лукашэнка шчыра пажадаў яму поспехаў:

— Гэты чалавек, калі вы яго падтрымаеце, можа вам вельмі сур'ёзна дапамагчы, усёй краіне дапамагчы зрабіць з Гомельскай вобласці проста квітнеючы край.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

## Надаць імпульс развіццю рэгіёна

**Згодна з працэдурай, на пазачарговай сесіі Гомельскага абласнога Савета дэпутатаў быў зацверджаны новы кіраўнік рэгіёна.**

Прадставіў новага губернатара актыву Гомельшчыны кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта. Ігар Сергеенка звярнуў увагу на шлях у працоўнай дзейнасці, які прайшоў Іван Крупко: займаў пасады першага намесніка старшыні, начальніка ўпраўлення сельскай гаспадаркі і харчавання Нясвіжскага райвыканкама, старшыні Нясвіжскага райвыканкама, да 2020 года — старшыні Мінскага райвыканкама, з мінулага года — міністра сельскай гаспадаркі і харчавання Рэспублікі Беларусь.

— Іван Іванавіч Крупко паказаў сябе дастаткова кампетэнтным кіраўніком, ім ствараліся ўмовы для развіцця аграпрамысловага комплексу. За непрацяглы перыяд асвоіў практычна ўсе напрамкі, вывучыў рэгіёны, у тым ліку і добра валодае абстаноўкай у Гомельскай вобласці, — звярнуў увагу Ігар Сергеенка. — Думаю, што вопыт і прафесіяналізм Івана Іванавіча Крупко дадуць магчымасць надаць імпульс развіццю вашага рэгіёна.

Як было падкрэслена, усе задачы, што стаяць перад Гомельшчынай, новаму кіраўніку давядзецца вырашаць пры падтрымцы моцнай каманды, якую неабходна сабраць, — і гэта адна з першых задач, што паставіў перад новым кіраўніком рэгіёна Прэзідэнт.

Удзельнікамі сустрэчы было адзначана, што ў рэгіёне пры падтрымцы Івана Крупко на пасадзе міністра сельскай гаспадаркі і харчавання былі рэалізаваны інвестпраекты, знакавыя для развіцця аграрнай галіны Гомельшчыны, якія дапамагаюць у тым ліку замацаваць спецыялістаў, маладыя сем'і на вёсцы, забяспечыць кадрамі сельгаспрадпрыемствы ў раёнах.

Ад актыву Гомельшчыны прагучалі словы падзякі за работу ў вобласці ў адрас былога старшыні Гомельскага аблвыканкама Генадзя Салаўя.

Новы кіраўнік рэгіёна Іван Крупко адзначыў:

— Вельмі высокія давер кіраўніка дзяржавы і адказнасць перад Прэзідэнтам, перад краінай і жыхарамі Гомельскай вобласці. Галоўнай сваёй мэтай стаўлю павышэнне ўзроўню і якасці жыцця людзей. Каб дабіцца гэтай мэты, патрэбна моцная і магутная каманда аднадумцаў. Вертыкаль улады ў рэгіёне павінна працаваць вельмі дакладна, абапіраючыся на ўзаемадзеянне з насельніцтвам, на адкрытую работу.

Прыярытэтным вектарам у рабоце новы кіраўнік рэгіёна лічыць эканоміку. Ён запэўніў, што ўсе пачатыя ў вобласці праекты будуць завершаны. Асаблівая ўвага да аграрнага сектара — навядзенне парадку і тэхналагічнай дысцыпліны

— У вобласці за гэтыя гады зроблена вельмі шмат, а трэба зрабіць яшчэ больш, — рэзюмаваў Іван Крупко.

---

Добрая навіна

# ДЛЯ ЗДАРОЎЯ ДЗЯЦЕЙ

### У Брэсце ўрачыста адкрылі новы лячэбны корпус абласной дзіцячай бальніцы

**Будаўніцтва пачалося ў сакавіку мінулага года. Хоць афіцыйна будынак называецца прыбудовай да корпуса, ён уяўляе сабой чатырохпавярховы гмах агульнай плошчай 9200 метраў квадратных, разлічаны на 147 ложкаў і прадугледжвае размяшчэнне чатырох аддзяленняў дзіцячай бальніцы.**

Сюды неўзабаве са старых карпусоў пераедуць аддзяленне анестэзіялогіі і рэанімацыі, педыятрычнае аддзяленне для новanароджаных і неданошаных дзяцей, педыятрычнае аддзяленне для дзяцей да года з паліятыўнымі ложкамі і аддзяленне для дзяцей з кардыярэўматалагічнай, гематалагічнай і нефралагічнай паталогіямі. У корпусе таксама будзе размешчаны кабінет магнітна-рэзанансной тамаграфіі для правядзення даследаванняў дзяцей усіх узростаў, у тым ліку з выкарыстаннем наркозна-дыхальнай апаратуры. Аб'ект разам з абсталяваннем абышоўся бюджэту ў 38 мільёнаў рублёў.

**Галоўны ўрач установы Сяргей КОЎШЫК** сказаў, што медыкі вельмі ўдзячныя будаўнікам арганізацыі «Палессежылбуд» за плённае супрацоўніцтва, за якасную работу на ўсіх этапах будаўніцтва. Сімвалічны ключ галоўнаму ўрачу перадаў **выконваючы абавязкі генеральнага дырэктара ААТ «Палессежылбуд» Аляксей МАРОЗАЎ.**

— З любога куточка Брэсцкай вобласці мы зможам пры неабходнасці дастаўляць сюды дзяцей і аказваць ім высокатэхналагічную дапамогу, — сказаў на цырымоніі адкрыцця **старшыня Брэсцкага аблвыканкама Юрый ШУЛЕЙКА.** — За кошт новага абсталявання ў нас пашырыліся магчымасці аказання як экстраннай, так і планавай дапамогі.

Кіраўнік раёна адзначыў таксама, што развіццё дзіцячай установы аховы здароўя на гэтым не спыняецца, зараз вядуцца праектныя работы па рэканструкцыі існуючага лячэбнага корпуса. Распачаць будаўніцтва плануецца ўжо ў наступным годзе.

Высокую ацэнку новаму аб'екту даў **міністр аховы здароўя краіны Дзмітрый ПІНЕВІЧ.** Паводле слоў міністра, тут задзейнічаны ўсе дасягненні сучаснай медыцынскай навукі.

Адказваючы на пытанні журналістаў пазней, міністр зазначыў, што інтэнсіўнасць цыркуляцыі каранавіруса паменшылася, новы штам «Амікрон» пакуль не выяўлены, але, хутчэй за ўсё, ужо цыркулюе. І на спадзе чарговай хвалі захваральнасці самы час зрабіць прышчэпку тым, хто гэтага пакуль не зрабіў.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

Энергетыка

# Другі энергаблок БелАЭС будзе ўведзены ў эксплуатацыю да лета 2022 года

**Аб гэтым заявіў журналістам прэм'ер-міністр Раман ГАЛОЎЧАНКА ў час наведвання Беларускай атамнай электрастанцыі. Учора, у Дзень энергетыка, пачалася загрузка ў рэактар другога энергаблока свежага ядзернага паліва, перадае БелТА.**

«Мы рухаемся па плане і да лета наступнага года плануем увесці другі энергаблок, — сказаў прэм'ер. — Такім чынам, БелАЭС выйдзе на намінальную магутнасць і будзе генерыраваць каля 40 працэнтаў усёй электраэнергіі краіны».

Першы намеснік генеральнага дырэктара па атамнай энергетыцы «Расатама» Аляксандр Лакшын адзначыў, што дзяржкарпарацыя будзе прадаўжаць актыўнае ўзаемадзеянне з беларускім бокам і пасля таго, як другі энергаблок БелАЭС увядуць у эксплуатацыю.

Па словах Рамана Галоўчанкі, першы энергаблок Беларускай атамнай электрастанцыі дазволіў краіне сэканоміць на замяшчэнні імпарту прыроднага газу каля $250 млн. З запускам двух энергаблокаў краіна зможа замяшчаць каля 4,5 млрд куб. м газу ў год.

«Гэта дае новыя магчымасці для павелічэння электраспажывання, на што сёння вялікі попыт. Ужо цяпер звяртаюцца інвестары, якія цікавяцца магчымасцю набыцця вялікіх аб'ёмаў электраэнергіі для іх патрэб. Гэта датычыцца як прамысловых энергаёмістых вытворчасцяў, так і такіх запатрабаваных цяпер сфер, як той жа майнінг», — адзначыў Раман Галоўчанка. Ён акцэнтаваў, што Беларусь выконвае ўсе рэкамендацыі міжнародных арганізацый у плане бяспекі АЭС.

Гучная справа

# 77 ГАДОЎ КАЛОНІІ НА ЧАЦВЯРЫХ

**Чатырох анархістаў прыгаварылі да 20 гадоў калоніі, паведамляе БелТА са спасылкай на прэс-службу Мінаблсуда.**

Па сукупнасці злачынстваў Ігар Аліневіч і Сяргей Раманаў атрымалі па 20 гадоў калоніі, Дзмітрый Дубоўскі — 18, Дзмітрый Разановіч — 19. Раманаў будзе адбываць пакаранне ў калоніі строгага рэжыму, астатнія — узмоцненага. Справа разглядалася ў закрытым судовым пасяджэнні, публічна была абвешчана толькі рэзалютыўная частка прысуду.

Як паведамілі раней у Дзяржпагранкамітэце, група анархістаў была затрымана 28 кастрычніка мінулага года каля ўкраінскай граніцы ў раёне населенага пункта Забоззе Ельскага раёна. У затрыманых знайшлі дзве адзінкі агнястрэльнай зброі з боепрыпасамі, баявую ручную гранату, траўматычны пісталет і патроны да яе, халодную зброю і балончыкі з пярцовым газам, форму і заплечнікі ваеннага ўзору, палаткі, сапёрную рыдлёўку, сякеру, ліхтары. Акрамя таго, пры сабе яны мелі ноўтбукі і планшэты, GPS-трэкеры, відэарэгістратары, фотакамеру, флэш-назапашвальнікі, сім-карту ўкраінскага сотавага аператара, сродкі радыёсувязі з гарнітурамі схаванага нашэння, іншую спецыяльную экіпіроўку і рыштунак, прадукты харчавання, банкаўскія карты і грашовыя сродкі ў розных валютах.

У Дзяржпагранкамітэце тады паведамлялі, што менавіта гэтыя людзі ўчынілі напад на будынак ДАІ ў Мазыры 28 кастрычніка мінулага года. «Вядома таксама, што арганізаваная група ўчыніла напад і на будынкі ўпраўлення Дзяржаўнага камітэта судовых экспертыз у Салігорску, раённай пракуратуры. Мэтай была радыкалізацыя і дэстабілізацыя сітуацыі ў краіне. Затрымалі групу ў лесе паблізу ўкраінскай граніцы. Анархісты планавалі адыход з беларускай тэрыторыі», — адзначыў прадстаўнік камітэта Антон Бычкоўскі.

Тым часам стала вядома, што офіс Генеральнага пракурора Украіны адмовіў у задавальненні просьбы Генпракуратуры Беларусі аб аказанні прававой дапамогі па крымінальнай справе ў дачыненні да «групы Аліневіча», якая была накіравана яшчэ на стадыі папярэдняга расследавання. Аб гэтым паведамілі ў беларускім наглядным ведамстве. «Украінскія калегі матывавалі такую пазіцыю тым, што запытаная прававая дапамога пагражае яе суверэнітэту і бяспецы. Тым самым украінскія ўлады выказалі сваё стаўленне да ацэнкі дзеянняў абвінавачаных. І гэтая ацэнка відавочна не мае асуджальнага характару», — адзначылі ў Генпракуратуры.

Кантэкст

# БАНДЫЦКІ ЛОНДАН

## Чаму брытанскія ўлады «гуляюць у маўчанку»?

**«Ва ўстанове аховы здароўя дыягнаставаны пералом носа, страсенне мозгу і траўматычны пералом зуба» — так падчас медыцынскага агляду былі апісаны наступствы жорсткага крымінальнага нападу на чалавека. Між тым гэта цытата з паведамлення Міністэрства замежных спраў Беларусі. Гаворка вядзецца аб нападзе на беларускае пасольства ў Лондане. Спачатку групай асоб быў сапсаваны фасад будынка дыпустановы, а пасля атакаваны беларускія дыпламаты. Аднаму з іх былі нанесены сур'ёзныя цялесныя пашкоджанні, спатрэбілася тэрміновая медыцынская дапамога.**

### Аблічча фанатыкаў

Паводле інфармацыі МЗС Беларусі, пасля прыбыцця праваахоўных органаў радыкалы распачалі спробу ўцячы з месца здарэння. Тым не менш частку тых, хто нападаў, затрымала дыпламатычная паліцыя Лондана. Устаноўлена, што асобы, як мяркуецца, уваходзяць у радыкальную эмігранцкую групоўку «Надзея».

«Гэтая спроба расправы, учыненая ў адносінах да асоб, якія па абавязку сваёй службы абараняюць інтарэсы беларускіх грамадзян і працуюць над паляпшэннем міждзяржаўных адносін, яшчэ раз красамоўна дэманструе сапраўднае аблічча і метады дзеянняў фанатыкаў, якіх шэраг краін калектыўнага Захаду ўпарта спрабуе выдаваць за мірных пратэстоўцаў», — падкрэслілі ў міністэрстве.

Тым часам у лонданскай паліцыі «Бі-бі-сі» расказалі, што ім паведамілі аб беспарадках, якія адбываюцца каля Пасольства Беларусі. «Супрацоўнік паведаміў, што падвергся нападу і атрымаў траўму твару. Непадалёк быў затрыманы і ўзяты пад варту адзін мужчына», — заявілі ў паліцыі, дадаўшы, што падрабязнасці здарэння высвятляюцца. І ўсё, дасюль ніякай інфармацыі ні ад лонданскіх паліцэйскіх, ні ад афіцыйнага Лондана (на тэрыторыі Вялікабрытаніі пацярпелі афіцыйныя асобы замежнай дзяржавы) не паступала.

Абураюць паводзіны супрацоўнікаў брытанскіх праваахоўных органаў, якія дапусцілі агрэсіўныя дзеянні «беламайданаўцаў» у адносінах да нашай дыпламатычнай місіі, заявіў БелТА член Савета Рэспублікі Алег Дз'ячэнка. «Дня не праходзіць, каб палітычныя злачынцы, якія схаваліся на Захадзе ад беларускага правасуддзя, не праявілі б сваёй злавеснай сутнасці. Гэтым разам напярэдадні калядных свят побач з Пасольствам Беларусі ў англійскай сталіцы яны арганізавалі шумную палітычную правакацыю, а пасля ўчынілі бандыцкі напад на беларускага консула», — сказаў сенатар. Паводле яго слоў, «застаецца без англійскага адказу пытанне: навошта і чаму англійскія ахоўнікі парадку дапусцілі антыбеларускую правакацыю, падчас якой быў жорстка збіты афіцыйны прадстаўнік беларускай дзяржавы, і ці будуць з усёй строгасцю брытанскага закона пакараны ўдзельнікі і падбухторшчыкі гэтага злачынства?»

### Абраза краіны і народа

Напад на Пасольства Беларусі ў Лондане, збіццё дыпламата — гэта абраза нашай краіны і народа. Такое меркаванне выказаў карэспандэнту БелТА намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па міжнародных справах Палаты прадстаўнікоў, старшыня Ліберальна-дэмакратычнай партыі Беларусі Алег Гайдукевіч.

«Спачатку будынак апаганілі, паліцыя не ўмяшалася, нікога не затрымалі, нікому не перашкодзілі гэта рабіць. Але аказалася мала. І ўвечары каля гэтага ж пасольства збілі беларускага дыпламата натоўпам. Нягоднікі напалі на чалавека і збілі яго, ён атрымаў цяжкія пашкоджанні, знаходзіцца ў бальніцы. Мы выдатна разумеем, што будынак пасольства знаходзіцца пад пастаянным назіраннем. Паліцыя бачыла, што там адбываецца», — адзначыў дэпутат.

Па словах Алега Гайдукевіча, вось яны двайныя, трайныя стандарты, вось яно міжнароднае права. «Мы патрабуем неадкладнага ўзбуджэння крымінальнай справы, мы патрабуем выканання закона, мы патрабуем прыцягнення гэтых асоб да крымінальнай адказнасці, а калі трэба — то і выдачы Рэспубліцы Беларусь. Беларускія спецслужбы павінны абараняць наш народ, абараняць краіну. Мы маем права прыцягваць да адказнасці тых, хто парушае наша заканадаўства, так, як мы лічым патрэбным. Кожны здраднік, хто поўзае па кабінетах Польшчы, Літвы, вымольваючы санкцыі, арганізоўвае тэракты на тэрыторыі Беларусі, павінен ведаць, што беспакаранымі вы не застанецеся і кожны з вас будзе прыцягнуты да крымінальнай адказнасці», — заўважыў Алег Гайдукевіч.

### Пытанні без адказу

Следчы камітэт разбіраецца ў абставінах нападзення на беларускіх дыпламатаў у Лондане. «Нападаючыя павodзілі сябе агрэсіўна і нахабна, выказвалі пагрозы, а таксама прымянілі гвалт у дачыненні да дыпламата. Па атрыманай следствам інфармацыі, матывам гэтых дзеянняў стала помста за выкананне дыпламатамі сваіх службовых абавязкаў», — адзначылі ў ведамстве. Галоўным следчым упраўленнем цэнтральнага апарата Следчага камітэта па гэтым факце распачата крымінальная справа па ч. 1 арт. 366 (гвалт у дачыненні да службовай асобы, якая выконвае службовыя абавязкі) Крымінальнага кодэкса Беларусі. Праводзіцца расследаванне. Відэазапіс інцыдэнту быў далучаны да матэрыялаў крымінальнай справы.

Цяпер нашы брытанскія партнёры абавязаны растлумачыць, чаму беларускае пасольства не знаходзіцца пад аховай, як так атрымалася, што збеглыя напалі на дыпламатаў. Такое меркаванне ў эфіры «Альфа Радыё» выказаў палітолаг Аляксандр Шпакоўскі. «Гэта агідны эпізод. Я заўсёды стараюся выказвацца дыпламатычна, але гэтым разам не буду. П'янае (альбо ў стане наркатычнага ап'янення) быдла з нецэнзурнай лаянкай і пагрозамі ў калькасці трое на аднаго нападала на нашых дыпламатаў. Консул быў вымушаны выслухоўваць паток мацюкоў і цярпець удары. Цяпер у чалавека дыягнаставана страсенне мозгу, пералом носа, пашкоджаны зубы. Калі б ён у адказ ужыў сілу, уяўляеце, як з гэтага б раздзьмулі? Магчыма, нападаючыя і чакалі, што цяпер дыпламаты кінуцца ў бойку», — адзначыў эксперт.

Аляксандр Шпакоўскі лічыць, што пасля здарэння Лондан апынуўся ў вельмі нязручным становішчы. «Мы выконваем свае міжнародныя абавязацельствы. Дыпламаты знаходзяцца пад абаронай Венскай канвенцыі. Незалежна ад таго, як мы ставімся да краіны, наша міліцыя ахоўвае іх дыпламатычныя ўстановы ў Беларусі. Цяпер нашы брытанскія партнёры абавязаны растлумачыць, чаму беларускае пасольства не знаходзіцца пад аховай, як так атрымалася, што збеглыя напалі на дыпламатаў, чаму ў Лондане, дзе дыджыталізацыя найвышэйшага ўзроўню, не могуць знайсці чалавека, які быў без маскі? Няхай цяпер апраўдваюцца на ўвесь свет», — сказаў ён.

Нездарма беларусы сабраліся на пікет каля Пасольства Вялікабрытаніі ў Мінску. Людзі патрабавалі ад улад Вялікабрытаніі расследаваць нападзенне на беларускіх дыпламатаў, пакараць вінаватых і прынесці публічныя прабачэнні. Лагічныя пытанні, якія застаюцца без адказу, — Лондан «гуляе ў маўчанку».

**Пётр ДУНЬКО.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### «Амікрон»-штам распаўсюдзіўся па 106 краінах

Аб гэтым паведаміла Сусветная арганізацыя аховы здароўя. У СААЗ падкрэсліваюць, што «агульная рызыка, звязаная з «амікрон»-варыянтам, які выклікае занепакоенасць, застаецца вельмі высокай». Як адзначаюць эксперты, «наяўныя сведчанні паказваюць на тое, што «амікрон»-варыянт мае перавагі ў росце перад «дэльта»-варыянтам і хутка распаўсюджваецца». Прычым гэта адносіцца таксама да краін з «высокім узроўнем імунітэту ў насельніцтва». Што датычыцца цяжару ходу захворвання пры заражэнні «амікронам», то звесткі на гэты конт пакуль з'яўляюцца «абмежаванымі», адзначаюць у СААЗ. У Вялікабрытаніі і ПАР расце колькасць пацыентаў, якія шпіталізуюцца ў сувязі з заражэннем каранавірусам. У сувязі з гэтым у СААЗ лічаць верагодным, што «многія сістэмы аховы здароўя могуць хутка аказацца перагружанымі».

### У ЗША з фондаў дапамогі ў пандэмію ўкралі $100 млрд

Такую інфармацыю агучыў каардынатар Сакрэтнай службы ЗША Рой Дотсан, паведаміла агенцтва Associated Press. Аб'ём украдзеных сродкаў складае прыкладна тры працэнты ад 3,4 трыльёна долараў, выдзеленых на дапамогу жыхарам і прадпрыемствам краіны. У Міністэрстве працы ЗША паведамілі, што значная частка з $87 млрд, якія нібыта былі выплачаныя як дапамога па беспрацоўі, была ўкрадзеная злачынцамі. Цяпер Сакрэтная служба ЗША замарозіла сродкі з урадавага пакета дапамогі ў рамках праверак на прадмет махлярства ў сферы беспрацоўя і выдачы крэдытаў. Вядзецца каля 900 расследаванняў ва ўсіх штатах, арыштавана каля 100 чалавек.

### Адкрыты новы від драпежнага дыназаўра, які мог залазіць на дрэвы

Вучоныя прыйшлі да высновы, што рэшткі дыназаўра, выяўленыя на брытанскім востраве Уайт у праліве Ла-Манш у 2004 годзе, адносяцца да раней невядомага віду, роднаснага велацыраптару. Гэта адзначаецца ў паведамленні Універсітэта Бата (Вялікабрытанія). «Ён датуецца раннім мелавым перыядам, больш за 100 мільёнаў гадоў таму. Новая жывёла была названа Vectiraptor greeni ў гонар мясцовага калекцыянера Міка Грына, які знайшоў яе косткі пасля таго, як іх змыла са скал на паўднёвым узбярэжжы вострава», — паведамілі ва ўніверсітэце. Жывёла была памерам каля трох метраў у даўжыню ад носа да хваста і выкарыстоўвала вялізныя рэжучыя кіпцюры на нагах, каб расправіцца са сваёй здабычай. Векцыраптар належаў да групы дыназаўраў, яны, як і іх сучасныя сваякі — птушкі, — былі пакрытыя доўгімі пёрамі. Сярод вядомых прадстаўнікоў дадзенай групы — велацыраптар з Манголіі, дэйнаніх і гіганцкі ютараптар з ЗША.

Парламенцкі дзённік

# «Бюджэтны пакет» і Кодэкс аб адукацыі

**На закрыцці шостай сесіі Савета Рэспублікі на парадку дня сенатараў было амаль 20 пытанняў.**

З эканамічнага блока парламентарыі ўхвалілі законапраекты «Аб бюджэце дзяржаўнага пазабюджэтнага фонду сацыяльнай абароны насельніцтва Рэспублікі Беларусь на 2022 год», «Аб змене законаў па пытаннях падаткаабкладання», «Аб рэспубліканскім бюджэце», «Аб свабодных эканамічных зонах» і «Аб інвестыцыях».

У цэнтры ўвагі сенатараў таксама знаходзіўся праект закона «Аб генацыдзе беларускага народа», за які аднагалосна аддалі свае галасы.

На парадку дня быў і гуманітарны складнік — члены Савета Рэспублікі заслухалі змены ў Кодэксе аб адукацыі.

Больш падрабязна аб разглежаных законапраектах чытайце заўтра ў чарговым нумары «Мясцовага самакіравання».

* * *

**Сенатары таксама прынялі зварот да еўрапейскіх парламентарыяў у сувязі з неправамернымі заявамі аб сітуацыі ў Беларусі.**

— Выклікае адназначнае непрыманне і абмеркаванне, што беларуская тэматыка разглядаецца на аснове адкрытых фэйкаў і лжывай інфармацыі, якая паступае ад людзей, якія заклікаюць да санкцый здраджваюць сваёй краіне — Рэспубліцы Беларусь, — зачытаў зварот **старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Сяргей РАЧКОЎ.**

Ён падкрэсліў, што беларускія парламентарыі катэгарычна не прымаюць сцвярджэнні аб датычнасці беларускага боку да стварэння міграцыйнага крызісу на граніцы з Еўрапейскім саюзам.

— Беларусь не з'яўляецца прычынай і крыніцай гэтай праблемы. Людзі бягуць ад вайны і галечы з краін Блізкага Усходу, — падкрэсліў выступоўца. — Вамі, еўрапейскімі палітыкамі, гэтым бежанцам было абяцана найлепшае жыццё. Беларускія сенатары, у адрозненне ад еўрапейскіх парламентарыяў, не па чутках ведаюць сітуацыю на граніцы. Савет Рэспублікі з першага дня дапамагае абяздоленым, для іх створаны прымальныя ўмовы, сітуацыя пад кантролем.

У звароце адзначаецца, што польскае кіраўніцтва пераступіла мноства чырвоных ліній у дачыненні да бежанцаў, перайшло межы здаровага сэнсу і чалавечай маралі. Гэта пацвярджаюць расповеды польскага вайскоўца, які папрасіў у Беларусі палітычнага прытулку.

— Злачынныя дзеянні польскага боку па жорсткіх расправах над мігрантамі на граніцы старанна задакументаваны і прааналізаваны праваахоўнымі органамі Беларусі. Мы не будзем пра гэта маўчаць. Усе матэрыялы перададуць у міжнародныя арганізацыі і міжпарламенцкія структуры, — цытуе тэкст звароту старшыня профільнай камісіі.

Аўтары дакумента заклікаюць еўрапейскіх парламентарыяў і чыноўнікаў пачуць праўдзівую інфармацыю аб міграцыйным крызісе, пазіцыю беларускага боку, патрабуюць не парушаць нормы міжнароднага права.

**Вольга АНУФРЫЕВА.**

# Аператыўна, зладжана, сістэмна і па-добраму да людзей

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Відавочна: нас не пакінуць у спакоі. Ва ўмовах маштабнай і інтэнсіўнай гібрыднай вайны, якая развязана супраць нашай краіны, мы павінны быць гатовыя да рэагавання на самыя непрадказальныя выклікі.

Чарговым такім выклікам для нас стала міграцыйная сітуацыя на беларуска-польскай граніцы. Па даручэнні кіраўніка дзяржавы на Савет Рэспублікі ўскладзена агульнае каардынаванне гуманітарнай місіі. Асаблівая ўвага — дзецям і цяжарным жанчынам.

Міграцыйная сітуацыя чарговы раз паказала, наколькі важныя нармальныя адносіны з суседзямі, цывілізаванае ўзаемадзеянне паміж краінамі і народамі, доступнасць міжнародных пляцовак для давядзення пазіцыі любой дзяржавы і гатоўнасць пачуць праўду, нават калі яна не ўпісваецца ў нечую геапалітычную стратэгію.

Сёння надзвычай актуальным з'яўляецца прынцыповае і рашучае адстойванне нацыянальных інтарэсаў, данясенне свету праўды пра Беларусь.

Для гэтага трэба максімальна выкарыстоўваць магчымасці міжпарламенцкіх пляцовак, міжнародных арганізацый, форумаў і канферэнцый, сустрэч з замежнымі палітыкамі і грамадскімі дзеячамі.

Нам неабходна нарошчваць супрацоўніцтва з саюзнікамі, стратэгічнымі партнёрамі і іншымі краінамі, якія гатовы канструктыўна працаваць з нашай краінай.

Прыярытэтам з'яўляецца паглыбленне інтэграцыі ў рамках Саюзнай дзяржавы.

І цяпер задача саюзных парламентарыяў — актыўна ўключыцца ў маштабную работу па працягу ўніфікацыі, гарманізацыі і збліжэння нацыянальных заканадаўстваў. Са Старшынёй Савета Федэрацыі Федэральнага Сходу Расійскай Федэрацыі Валянцінай Іванаўнай Матвіенка мы дасягнулі дамоўленасці аб'яднаць нашы намаганні ў гэтай рабоце і ўзяць яе на жорсткі парламенцкі кантроль.

Парламентарыі Беларусі і Расіі павінны выступаць адзіным фронтам і на міжнароднай арэне. Як, напрыклад, гэта было падчас 143-й Асамблеі Міжпарламенцкага саюза, калі сумеснымі намаганнямі ўдалося не дапусціць уключэння ў парадак дня антыбеларускай рэзалюцыі.

Для нас вельмі важна захаваць прысутнасць на розных міжнародных пляцоўках. У мэтах давядзення беларускай пазіцыі, прасоўвання сумесных праектаў можна выкарыстоўваць не толькі парламенцкую дыпламатыю.

У сесійны перыяд члены Савета Рэспублікі актыўна ўдзельнічалі ў выкананні задач, якія стаяць перад дзяржавай і грамадствам. Галоўная мэта заканадаўчых навацый — захаванне суверэнітэту і незалежнасці Рэспублікі Беларусь, яе нацыянальных інтарэсаў, забеспячэнне бяспекі нашых грамадзян і іх права самім вызначаць сваю будучыню.

Асноўным дакументам, над якім мы працуем зараз, з'яўляецца Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь.

Трэба адзначыць, што многія палажэнні, якія ўключаны ў рабочы праект Канстытуцыі, зыходзілі ад Савета Рэспублікі. Гэта адзіны дзень галасавання па выбарах дэпутатаў усіх узроўняў, работа ў фармаце адной сесіі ў год, асобны «маладзёжны» артыкул, які стымулюе маладых людзей да адказнасці за будучыню краіны і з'яўляецца сведчаннем высокага даверу дзяржавы да іх.

Канстытуцыйныя навацыі накладаюць на Савет Рэспублікі вялікую адказнасць, паколькі мяркуецца, што члены Савета Рэспублікі ўвойдуць у склад Усебеларускага народнага сходу. Акрамя таго, роля Савета Рэспублікі як дзяржаўнага інстытута можа быць істотна ўзмоцнена, у тым ліку за кошт пашырэння паўнамоцтваў у кадравай сферы.

Абнаўленне Асноўнага Закона запатрабуе сур'ёзнай заканадаўчай работы. Мы павінны быць гатовыя да прыняцця новых і карэкціроўкі значнай колькасці дзеючых нарматыўных прававых актаў.

Як толькі афіцыйны праект змен у Канстытуцыю будзе абнародаваны, нам трэба будзе маштабная работа па данясенні да грамадзян значэння прапанаваных навацый.

Мы павінны тлумачыць людзям, што на рэферэндуме яны будуць галасаваць за будучыню сваёй краіны і будучыню сваіх дзяцей. І тым больш важна, каб у момант прыняцця рашэння ў грамадзян было праўдзівае ўяўленне аб канстытуцыйных навацыях, а не тое, якое ім спрабуюць навязваць дэструктыўныя сілы, прычым у большасці сваёй — з-за мяжы.

Рэспубліканскі рэферэндум па прыняцці змяненняў у Асноўны Закон стане лёсавызначальнай падзеяй у жыцці нашай краіны. Гэта адказны перыяд для ўсіх органаў улады — і нам неабходна ўзяць актыўны ўдзел у падрыхтоўцы і правядзенні такой важнай палітычнай кампаніі. Рэферэндум павінен прайсці на высокім арганізацыйным узроўні, у поўнай адпаведнасці з Канстытуцыяй і дзеючым выбарчым заканадаўствам.

У ходзе сесіі мы прынялі да ведама пяць дэкрэтаў Прэзідэнта, разгледзелі 31 законапраект.

Жорсткім адказам на недружалюбныя дзеянні Еўрапейскага саюза ў адносінах да Беларусі і адыёзным актывістам, якія ім патураюць, з ліку грамадзян нашай краіны стала адабрэнне Саветам Рэспублікі законапраекта «Аб прыпыненні дзеяння Пагаднення паміж Рэспублікай Беларусь і Еўрапейскім саюзам аб рэадмісіі асоб, якія знаходзяцца без дазволу» і законапраекта «Аб змене Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь», якім уведзена крымінальная адказнасць за заклікі да санкцый.

З улікам бягучай геапалітычнай сітуацыі асаблівае значэнне мае законапраект «Аб генацыдзе беларускага народа», які заклікаНЫ замацаваць гістарычную памяць і праўду аб злачынствах фашыстаў і іх памагатых на беларускай зямлі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Увядзенне крымінальнай адказнасці за публічнае адмаўленне генацыду — гэта своечасовая заслона ад спроб скажэння і фальсіфікацыі гісторыі.

Мы і надалей будзем супрацьдзейнічаць любым спробам падрыву палітычнай і сацыяльна-эканамічнай стабільнасці ў нашай краіне.

Як сказаў Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь, паважаны Аляксандр Рыгоравіч Лукашэнка: «Мы павінны не проста выстаяць. Мы павінны развівацца як след, рухацца наперад, паказваючы ім, што мы і без іх абыдземся. Для гэтага ў нас ёсць усё».

Таму і бюджэтныя законапраекты накіраваны на далейшае развіццё галін і сектараў эканомікі, рэгіёнаў нашай краіны. Сфарміраваны яны такім чынам, каб грамадзяне не адчулі на сабе ніякіх негатыўных наступстваў санкцый.

Ключавыя задачы бюджэтнай палітыкі ў 2022 годзе — гэта забеспячэнне збалансаванасці і ўстойлівасці рэспубліканскага і мясцовых бюджэтаў, падтрыманне пазыковай устойлівасці на бяспечным узроўні, сацыяльная абароненасць насельніцтва і павышэнне на гэтай аснове дабрабыту нашых грамадзян.

Абапіраючыся на пытанні, якія хвалююць насельніцтва, парламентарыі разгледзелі новая рэдакцыя Кодэкса аб адукацыі, законапраекты, накіраваныя на забеспячэнне бяспекі і эфектыўнасці арганізацыі дарожнага руху, якасці і даступнасці натарыяльных паслуг, адказнасці тураператараў, якія ажыццяўляюць дзейнасць у сферы міжнароднага выязнога турызму.

Працягваецца работа над сацыяльна значнымі законапраектамі, накіраванымі на развіццё культуры, спорту, забеспячэнне сацыяльнай інтэграцыі людзей з інваліднасцю, аказанне псіхалагічнай дапамогі.

Па даручэнні кіраўніка дзяржавы пры Савеце Рэспублікі створаны экспертны савет, які дзейнічае ўжо больш за паўгода. Усяго саветам разгледжана 66 праектаў. Да яго работы мы прыцягваем кампетэнтных экспертаў з ліку кіраўнікоў рэгіёнаў і буйных прадпрыемстваў, практыкаў, вучоных, што дазваляе істотна павысіць якасць і эфектыўнасць заканадаўчых мер, што прымаюцца.

Многія важныя пытанні па ўдасканаленні заканадаўства ўдалося вырашыць дзякуючы канструктыўнаму і зладжанаму ўзаемадзеянню з Урадам, рэспубліканскімі і мясцовымі органамі ўлады.

Савет Рэспублікі — гэта палата тэрытарыяльнага прадстаўніцтва, і па кожным нашым кроку нават у самым аддаленым населеным пункце фарміруецца агульнае меркаванне людзей як аб дзяржаўнай уладзе, так і аб палітычным курсе, які ёю праводзіцца.

Як працуюць прынятыя парламентарыямі законы, як рэалізоўваюцца нацыянальныя праекты, стратэгіі і праграмы развіцця краіны, як гэта ўсё ўспрымаецца людзьмі — можна пазнаць толькі з непасрэднай і адкрытай гутаркі з імі. Менавіта таму прыярытэтам Савета Рэспублікі з'яўляецца работа з насельніцтвам. У нашай краіне яна праводзіцца па сістэмнай аснове — кожны чалавек павінен разумець, што ён будзе пачуты. Як гаворыць наш Прэзідэнт, мы павінны ўмець слухаць і, самае галоўнае, чуць людзей.

З чэрвеня гэтага года намі праведзены адзіныя дні прыёму грамадзян у Мінскім раёне, Віцебскай, Брэсцкай, Гродзенскай абласцях і горадзе Мінску.

Такая форма работы дазваляе прыняць усяго за адзін дзень сотні грамадзян, выявіць найбольш актуальныя праблемы, якія ёсць у канкрэтным рэгіёне, а затым абмеркаваць іх на пашыраных пасяджэннях Прэзідыума Савета Рэспублікі з удзелам дэпутацкага корпуса, кіраўніцтва мясцовых органаў улады.

Многія пытанні пры правядзенні асабістых прыёмаў грамадзян вырашаюцца тут жа. Таму трэба больш адказна працаваць з насельніцтвам на мясцовым узроўні.

У рабоце з людзьмі важна быць шчыра зацікаўленымі, не заставацца абыякавымі: фармалізм людзі адчуваюць адразу. Кожнае пытанне трэба імкнуцца даводзіць да лагічнага завяршэння, дзейнічаючы сістэмна: няважных праблем не бывае.

Савету Рэспублікі трэба працаваць з усімі катэгорыямі насельніцтва, пачынаючы з моладзі, з яе патрыятычнага выхавання. Мы мусім быць разам з моладдзю. Адкрыта і сумленна размаўляйце з маладымі людзьмі на хвалюючыя іх тэмы, удзельнічайце ў прапанаваных імі праектах і падтрымлівайце іх.

У гэтай рабоце трэба аб'ядноўваць намаганні ўсіх зацікаўленых і дзейнічаць разам.

Не менш важным напрамкам у нашай рабоце з'яўляецца грамадская дзейнасць. Сваім прыкладам мы павінны паказваць людзям канструктыўную грамадзянскую пазіцыю, вучыць іх наладжваць нармальныя чалавечыя адносіны і весці культурны дыялог.

Мы павінны імкнуцца да таго, каб Савет Рэспублікі стаў адным з ключавых цэнтраў прыцягнення грамадска карысных ініцыятыў і праектаў.

Пры гэтым важна, каб грамадская дзейнасць ішла ад душы, каб усе мы былі рэальна ў ёй зацікаўлены, не шкадавалі свайго часу і сіл.

На цяперашнім этапе перад Саветам Рэспублікі стаяць сур'ёзныя задачы, вырашэнне якіх запатрабуе максімальнай самааддачы, мабілізацыі ўсіх нашых ведаў і прафесіяналізму, маналітнасці і спраўнасці.

Нас чакае напружаная работа па выкананні мэтавых установак Прэзідэнта нашай краіны Аляксандра Рыгоравіча Лукашэнкі, далейшай рэалізацыі рашэнняў VI Усебеларускага народнага сходу, Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны:

у галіне міжнароднага супрацоўніцтва — максімальнае выкарыстанне кропак спалучэння, форм узаемадзеяння для давядзення праўдзівай інфармацыі аб сітуацыі ў Беларусі і палітычным курсе, які праводзіцца кіраўніцтвам нашай краіны;

у заканадаўчай дзейнасці — стварэнне прававых механізмаў укаранення канстытуцыйных навацый, працяг уніфікацыі, гарманізацыі і збліжэння заканадаўства Рэспублікі Беларусь і заканадаўства Расійскай Федэрацыі, а таксама ўдасканаленне нацыянальнага заканадаўства з улікам выклікаў і патрабаванняў часу;

у рамках дзейнасці па абнаўленні Канстытуцыі — удзел у грамадскіх абмеркаваннях праекта і ў рабоце па растлумачэнні грамадству канстытуцыйных навацый, у падрыхтоўцы і правядзенні рэспубліканскага рэферэндуму;

у рабоце з насельніцтвам — правядзенне сустрэч з працоўнымі калектывамі, уважлівае стаўленне да кожнага звароту, эфектыўнае ўзаемадзеянне з моладдзю і грамадскімі структурамі, актыўная работа са сродкамі масавай інфармацыі.

Наш абавязак — у поўнай меры апраўдаць чаканні беларускага народа, які даверыў нам права выступаць ад яго імя і адстойваць нацыянальныя інтарэсы.

Як сказаў наш Прэзідэнт: «Трымайце краіну. Гэта ваша краіна. Мы з вамі яе выкрышталізавалі і нікому не павінны аддаць!»

Упэўнена, што мы зробім усё магчымае для развіцця і працвітання нашай Айчыны.

*Поўны тэкст выступлення чытайце на сайце*

# Законнасць, парадак і дастойны ўзровень жыцця

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

У найбліжэйшы час праект абноўленага Асноўнага Закона будзе вынесены на ўсенароднае абмеркаванне. Упэўнены, што рэферэндум расставіць усе кропкі над «і», прадэманструе мудрасць беларускага народа і яго імкненне застацца гаспадаром на сваёй зямлі.

На гэта было нацэлена і прыняцце Закона аб змяненні дзеючай Канстытуцыі, які стварае ўмовы для спакойнага і арганізаванага правядзення намечаных грамадска-палітычных пераўтварэнняў.

Найважнейшым вынікам сесіі стала прыняцце пакета бюджэтных законапраектаў. Прынцыпова тое, што мы захавалі сацыяльную накіраванасць бюджэту, стварыўшы неабходныя перадумовы для выканання дзяржавай сваіх абавязацельстваў перад грамадзянамі.

Змяненні, унесеныя ў Падатковы кодэкс, будуць працаваць на павышэнне ролі нацыянальнага бізнесу ў вырашэнні агульнадзяржаўных задач, фінансаванні найважнейшых сацыяльных праектаў і развіцці прамысловага патэнцыялу краіны.

Асаблівая ўвага на сесіі была ўдзелена ўмацаванню нацыянальнай бяспекі і абароне гістарычнай праўды, бо ў маральным сэнсе сучасная палітыка калектыўнага Захаду ў дачыненні да Беларусі нічым не лепшая за тое, што рабілі нацысты і іх памагатыя на нашай зямлі 80 гадоў таму.

Адным з адказаў на гэтую пагрозу і стала прыняцце законапраектаў, якія ўстанаўліваюць крымінальную адказнасць за заклікі да санкцый супраць Рэспублікі Беларусь і адмаўленне генацыду беларускага народа.

Велізарную ролю ў падтрыманні народнай еднасці і сувязі пакаленняў адыгрываюць адукацыя і культура. Таму пытанні патрыятызму і выхавання актыўнай грамадзянскай пазіцыі былі ключавымі пры прыняцці Кодэкса аб адукацыі. З такіх жа пазіцый трэба будзе працаваць і над папраўкамі ў законы па пытаннях культуры. Мы павінны прыцягнуць увагу грамадскасці да праблемы захавання нацыянальнай гісторыка-культурнай спадчыны.

У цэлым задачы дэпутацкага корпуса на перспектыву будуць вызначаны ў Пасланні кіраўніка дзяржавы беларускаму народу і парламенту. Аднак ужо сёння ў нас фарміруецца дастаткова аб'ёмная праграма заканатворчай дзейнасці.

Неабходна завяршыць работу над праектамі законаў аб змяненні Грамадзянскага кодэкса, аб ліцэнзаванні, аб іпатэцы, аб рынку каштоўных папер, аб барацьбе з карупцыяй. Запланавана таксама карэкціроўка Банкаўскага і Працоўнага кодэксаў, заканаў аб дзяржаўна-прыватным партнёрстве і аб процідзеянні манапалістычнай дзейнасці. Самая сур'ёзная работа мае адбыцца па падрыхтоўцы праекта прынцыпова новага кодэкса, які комплексна ўрэгулюе пытанні грамадзянскага і гаспадарчага судаводства.

Усе гэтыя дакументы профільным камісіям трэба разглядаць праз прызму рэалізацыі Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця да 2025 года, ўважліва звяраючы прапанаваныя нормы з рэальнымі патрэбамі рэгіёнаў, суб'ектаў гаспадарання і нашых выбаршчыкаў.

Самую пільную ўвагу дэпутатам неабходна ўдзяліць рэалізацыі Дэкрэта аб паглыбленні беларуска-расійскай інтэграцыі. Нам трэба сінхранізаваць свае намаганні з расійскімі калегамі. Аб гэтым мы дамовіліся падчас правядзення ў Мінску 61-й сесіі Парламенцкага сходу Саюза Беларусі і Расіі.

Важным вынікам саюзнай сесіі стала прыняцце Заявы ў сувязі з так званым міграцыйным крызісам. Дакумент асуджае палітыку двайных стандартаў і агрэсіўныя дзеянні польскіх сілавых ведамстваў у адносінах да бежанцаў.

Беларускія дэпутаты зрабілі ўсё магчымае, каб давесці да міжнароднай супольнасці аб'ектыўную інфармацыю аб сітуацыі на граніцы з Еўрасаюзам. І гэтыя аргументы былі пачутыя.

Дзякуючы падтрымцы нашых калег па геапалітычнай групе «Еўразія» ў Міжпарламенцкім саюзе, дэлегацый краін СНД і Грузіі, Блізкага Усходу, Азіі, Цэнтральнай і Лацінскай Амерыкі спроба прыняцця антыбеларускай рэзалюцыі на 143-й Асамблеі МПС пацярпела крах.

Нягледзячы на намаганні ізаляваць нашу краіну на міжнароднай арэне, беларускія дэпутаты працягваюць актыўна развіваць кантакты з парламентарыямі еўразійскіх дзяржаў, краінамі АСЕАН і Лацінскай Амерыкі. Важна, што гэтыя адносіны будуюцца на прынцыпах, якія цалкам выключаюць умяшальніцтва ва ўнутраныя справы адзін аднаго. І на першы план у іх выходзіць эканамічны парадак, які аб'ядноўвае ўсіх.

Кітай для нас — найважнейшы стратэгічны партнёр. Актуальныя задачы па вывадзе адносін паміж нашымі краінамі на новы ўзровень вызначаны Дырэктывай кіраўніка дзяржавы нумар 9. У сувязі з гэтым дэпутатам неабходна падрыхтаваць і ўнесці грунтоўныя прапановы па рэалізацыі палажэнняў Дырэктывы на парламенцкім узроўні.

Надзейным гандлёвым партнёрам для Беларусі з'яўляецца Інданезія. Яна стала чацвёртым рынкам у свеце для беларускага хлорыстага калію і плануе нарошчваць аб'ёмы закупак. У нас склаліся канструктыўныя адносіны з інданезійскімі калегамі, пра што гавораць вынікі іх нядаўняга візіту ў Беларусь. Важна адсочваць рэалізацыю ўзгодненых праектаў, тым больш што прадстаўнікі індэнезійскіх дзелавых колаў зноў збіраюцца наведаць нашу краіну.

Такім жа чынам трэба працаваць на лацінаамерыканскім і іншых напрамках. Патэнцыял там вялізны. У прыватнасці, на пляцоўцы Лацінаамерыканскага парламента трэба развіваць кантакты з Бразіліяй, Венесуэлай, Калумбіяй, Кубай, Эквадорам.

І ў цэлым у міжнародных арганізацыях неабходна працягваць актыўны пошук пунктаў спалучэння эканамічных інтарэсаў розных краін.

Што да заходняга вектара, то тут нам неабходна нарошчваць свае намаганні па адстойванні нацыянальных інтарэсаў. Гэта асноўная задача для беларускай дэлегацыі на маючым адбыцца зімовым пасяджэнні Парламенцкай асамблеі АБСЕ ў Вене.

Галоўнай задачай дэпутатаў у выбарчых акругах застаецца падрыхтоўка да рэспубліканскага рэферэндуму. Нам трэба зрабіць усё, што ад нас залежыць, каб ён прайшоў спакойна, арганізавана, строга ў рэчышчы нацыянальнага заканадаўства, а яго вынікі сталі адлюстраваннем свабоднага і ўсвядомленага выбару беларусамі шляху свайго развіцця.

Трэба ўважліва адсочваць сацыяльна-эканамічную сітуацыю ў рэгіёнах, быць побач са сваімі выбаршчыкамі і дапамагаць ім у вырашэнні надзённых праблем. Асноўны ўпор пры гэтым трэба зрабіць на выкананні задачы, пастаўленай кіраўніком дзяржавы, па недапушчэнні неабгрунтаванага росту цэн і насычэнні ўнутранага рынку запатрабаванымі таварамі. Профільным камісіям неабходна аператыўна заняцца прапрацоўкай прапаноў аб перадачы ў рэгіёны канкрэтных паўнамоцтваў, якія дапамогуць ліквідаваць бар'еры, што тармозяць развіццё нацыянальнага бізнесу, і стымуляваць рост імпартазамяшчэння.

Асаблівую ўвагу ў рамках падрыхтоўкі да рэферэндуму трэба звярнуць на тлумачальную работу з насельніцтвам. Людзі павінны з першых вуснаў атрымліваць інфармацыю аб дзеяннях улады і мерах, якія прымаюцца дзяржавай па захаванні краіны.

Паважаныя дэпутаты, надыходзяць святочныя дні. Вельмі важна, каб у гэты час нашай увагай не былі абдзелены самыя неабароненыя катэгорыі грамадзян, асабліва старыя і дзеці, якія аказаліся ў складанай жыццёвай сітуацыі.

Нядаўна ў краіне стартавала рэспубліканская дабрачынная акцыя «Нашы дзеці», у якой дэпутаты заўсёды бяруць самы актыўны ўдзел. Нам трэба падтрымаць гэты навагодні марафон добрых спраў і сёння.

*спікераў парламента zviazda.by.*

Парламенцкі дзённік

# З КОМПЛЕКСНЫМ ПАДЫХОДАМ

### Новаўвядзенні закрануць сферу ліцэнзавання, іпатэку, павысяць эфектыўнасць барацьбы з карупцыяй і ўрэгулююць сферы фізічнай культуры і спорту

**Пытанні барацьбы з карупцыяй і прававога рэгулявання гаспадарчай дзейнасці ўчора былі разгледжаны на чарговым пасяджэнні шостай сесіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу сёмага склікання. Акрамя таго, дэпутаты і прадстаўнікі іншых дзяржаўных інстытутаў абмеркавалі навацыі, якія неўзабаве закрануць сферу фізічнай культуры і спорту, механізм ліцэнзавання і іпатэчную дзейнасць.**

## ПАДАРУНКІ — З ФІКСАВАНАЙ ЦАНОЙ

У першым чытанні прыняты законапраект «Аб змяненні законаў па пытаннях барацьбы з карупцыяй». Комплексны праект распрацаваны Генеральнай пракуратурай сумесна з Вярхоўным Судом і іншымі зацікаўленымі дзяржаўнымі органамі з улікам практыкі прымянення Закона «Аб барацьбе з карупцыяй», які быў прыняты ў 2015 годзе.

Як адзначыў **генеральны пракурор Андрэй ШВЕД**, з'явіліся пытанні ў правапрымяненні, узніклі ініцыятывы і прапановы ў першую чаргу ад нашых грамадзян, якія закранаюць нормы і дзеянні Закона «Аб барацьбе з карупцыяй». «Дадзеным праектам удакладняецца прававое абавязацельства кіраўнікоў дзяржаўных органаў і арганізацый, у якіх доля ўласнасці дзяржавы 50 % і большая, у частцы адказнасці за выяўленне, прафілактыку карупцыйных правапарушэнняў і ліквідацыю наступстваў, — абазначыў канцэптуальныя лініі будучага дакумента генпракурор. — Акрамя таго, вызначаны парадак узаемадзеяння службовых асоб і органаў, якія ажыццяўляюць барацьбу з карупцыяй. У выпадку прыняцця закона не толькі яны будуць абавязаны прадастаўляць праваахоўным органам інфармацыю аб карупцыйных правапарушэннях, а і праваахоўныя органы будуць прадастаўляць звесткі кіраўнікам гэтых дзяржаўных органаў аб карупцыйных правапарушэннях для таго, каб яны праводзілі прафілактычныя мерапрыемствы».

— Закон будзе прыняты дзеля павышэння эфектыўнасці барацьбы з карупцыяй і аптымізацыі ўзаемадзеяння дзяржаўных і іншых органаў з мэтай прафілактыкі дадзенай негатыўнай з'явы, — удакладніла **член Пастаяннай камісіі па нацыянальнай бяспецы Марына ЛЯНЧЭЎСКАЯ.** — Мы ўлічылі правапрымяняльны вопыт, міжнародны, а таксама ратыфікаваныя міжнародныя дагаворы. У прыватнасці, пашыраецца пералік асоб, якім дзяржаўны служачы не можа аказваць садзейнічанне ў сувязі з інтарэсамі сваёй службы. У гэты пералік асоб цяпер трапляюць муж і жонка дзяцей: зяці і нявесткі. З'яўляецца адказнасць юрыдычнай асобы. Калі службовая асоба здзяйсняе проціpraўныя дзеянні ў інтарэсах дадзенай юрыдычнай асобы, прадугледжваецца адказнасць апошняй. Калі раней пасады дырэктара, намесніка дырэктара, галоўнага бухгалтара, намесніка галоўнага бухгалтара, касіра нельга было займаць блізкім сваякам, мужу і жонцы ў дзяржаўных арганізацыях, то цяпер яшчэ і ў арганізацыях з пераважнай доляй дзяржаўнай уласнасці. Яшчэ цікавае змяненне — удакладняецца кошт падарунка, які могуць прымаць службовыя асобы ў ходзе правядзення афіцыйных і пратакольных мерапрыемстваў. Сума не павінна перавышаць пяціразовы памер мінімальнай базавай велічыні.

## НОВЫ ЗАКОН

Праект закона «Аб ліцэнзаванні», разгледжаны ў першым чытанні, у прыватнасці, прадугледжвае максімальнае выкарыстанне інфармацыйных тэхналогій у працэсе ўзаемадзеяння ліцэнзавальных органаў з саіскальнікамі ліцэнзій і ліцэнзіятамі. Акрамя таго, вызначаны падыходы да ліцэнзавання масажу, дзейнасці па нарыхтоўцы (закупцы) лому і адходаў чорных і каляровых металаў. Павышаецца самастойнасць ліцэнзавальных органаў. Карэкціруецца пералік кантралюючых (наглядных) органаў, якія маюць паўнамоцтвы праводзіць праверкі. Прадугледжаны іншыя змяненні.

— Да нядаўняга часу рэгуляванне праваадносін у сферы ліцэнзавання ажыццяўлялася на падставе шэрагу ўказаў Прэзідэнта і Дэкрэта № 7 «Аб развіцці прадпрымальніцтва», — паведаміў **старшыня Пастаяннай камісіі па прамысловасці, паліўна-энергетычным комплексе, транспарце і сувязі Ігар КАМАРОЎСКІ.** — Па даручэнні кіраўніка дзяржавы цяпер гэтая сфера будзе рэгулявацца менавіта законам. Перш чым унесці законапраект у Палату прадстаўнікоў, над ім працавалі дзяржаўныя органы, вучоныя Нацыянальнай акадэміі навук. Натуральна, быў улічаны і міжнародны вопыт.

## ПРАВЫ АСОБЫ І ЖЫЛЛЁ Ў ІПАТЭКУ

У першым чытанні парламентарыі разгледзелі і законапраект «Аб змяненні кодэксаў» (па пытаннях прававога рэгулявання гаспадарчай дзейнасці). «У сувязі з істотнымі зменамі і ў эканамічным жыцці, і ў заканадаўчай сферы комплексная прапрацоўка законапраекта праводзілася на працягу апошніх гадоў з улікам патрабаванняў сённяшняга дня, — заўважыла **старшыня Пастаяннай камісіі па заканадаўстве Святлана ЛЮБЕЦКАЯ.** — Законапраектам прадугледжваецца комплекснае ўнясенне змяненняў, якія датычацца змен у дзейнасці суб'ектаў гаспадарання, страхавання, увядзення новых інстытутаў права, апцыёну, апцыённага дагавора, адзыўной даверанасці. Гэтыя інстытуты, як вывучалася ў ходзе прапрацоўкі законапраекта, фактычна дзейнічаюць. Яны ўспрынятыя бізнес-супольнасцю, і сёння стаіць пытанне іх фармалізацыі. Натуральна, вывучаліся пытанні рызык, звязаных з увядзеннем новых інстытутаў, кампетэнтнае меркаванне спецыялістаў».

Змяненні, якія датычацца простых грамадзян, звязаныя з раздзелам маёмасці паміж мужам і жонкай. Акрамя таго, чакаюцца новаўвядзенні, якія датычацца парадку атрымання ў спадчыну маёмасці. Прадугледжана і абарона правоў асобы. Асабліва гэта актуальна ў сувязі з прыняццем Закона «Аб абароне персанальных даных».

— Больш за ўсё насельніцтва хвалюе іпатэка жылля, — прадстаўляючы законапраект «Аб змяненні Закона Рэспублікі Беларусь «Аб іпатэцы» адзначыў **міністр эканомікі Аляксандр ЧАРВЯКОЎ.** — І ў гэтай сферы іпатэка працуе. Сёння толькі ў Беларусбанку заключана больш чым 3,1 тысячы дагавораў на агульную суму парадку 120 мільёнаў рублёў. Пры гэтым сярэдняя стаўка вагаецца каля 21 %.

Раней іпатэку можна было выкарыстоўваць на куплю жылля, а не на яго будаўніцтва. Цяпер гэтае пытанне чакаюць карэктывы.

Акрамя таго, у першым чытанні быў разгледжаны законапраект «Аб змяненні Закона Рэспублікі Беларусь «Аб фізічнай культуры і спорце». «Законапраект прадугледжвае ўдасканаленне Закона «Аб фізічнай культуры і спорце» ў мэтах стварэння спрыяльных умоў для развіцця ў нашай краіне фізічнай культуры і спорту, умацавання пазіцый Рэспублікі Беларусь у сусветнай спартыўнай супольнасці, а таксама для забеспячэння актуальнага, комплекснага і сістэмнага рэгулявання сферы фізічнай культуры і спорту», — заявіў, прадстаўляючы законапраект, **міністр спорту і турызму Сяргей КАВАЛЬЧУК.**

**Вераніка КАНЮТА.**

## Сведения о результатах проведения РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ

# «Ноябрь на Драйве! Мастеркард»

**1. Сведения об организаторе:**
Организатором рекламной игры является общество с ограниченной ответственностью «Рефорте», УНП 100422707 (далее – Организатор) с местом нахождения по адресу: 220030, Беларусь, г. Минск, пл. Свободы, д. 4, офисное помещение № 334. Электронный адрес: post@forte.by.

**2. Наименование рекламной игры:**
«Ноябрь на Драйве! Мастеркард».

**3. Срок начала и окончания рекламной игры:**
01 ноября 2021 г. – 20 января 2022 г.

**4. Сведения о государственной регистрации рекламной игры:**
Рекламная игра зарегистрирована в Министерстве антимонопольного регулирования и торговли Республики Беларусь 22 октября 2021 года, свидетельство о государственной регистрации рекламной игры № 4092.

**5. Сведения о количестве участников рекламной игры:**
В рекламной игре приняло участие 57 207 участников.

**6. Сведения о полном или частичном розыгрыше призового фонда:**
Призовой фонд разыгран полностью.

**7. Фамилия, инициалы победителя (победителей), его выигрыш (их выигрыши):**

| Наименование Приза | Ф.И.О. Победителя |
|---|---|
| **Автомобиль: Volkswagen Polo** Год выпуска: 2021. Цвет кузова: белый стоимостью 38 077,00 белорусских рублей и денежные средства в сумме 5 667,25 белорусских рублей, которые удерживаются Организатором для уплаты за Победителя подоходного налога с общей стоимости приза | Якута О.И. |

**8. Телефон для справок по вопросам проведения рекламной игры** + 375 29 678 94 39.

---

И З В Е Щ Е Н И Е О П Р О В Е Д Е Н И И А У К Ц И О Н А

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Борисовский шпалопропиточный завод» (продавец) проводит открытый аукцион по продаже**

## АВТОПОГРУЗЧИКА ВИЛОЧНОГО, модель – 40814,

**1981 года выпуска, инв. № 041037, зав. № 17319, номер двигателя 028345, рама шасси № 7842, изготовитель – ПО «Автопогрузчик», Украина, расположенного по адресу: Минская область, г. Борисов, ул. Сенная, 5.**

Начальная цена с НДС 20 % **– 4 418,69** бел. руб.
Задаток 10 % от начальной цены (**441,87** бел. руб.).

**Задатки перечисляются на р/с BY55BPSB30121082600169330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 20 (двадцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

Победитель (единственный участник) аукциона оплачивает Организатору аукциона вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 10 (десяти) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона.

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.rlt.by.**

Аукцион состоится **26.01.2022** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **25.01.2022** до **16.00** по указанному адресу.

**Тел.: (8017) 516-80-65, (8029) 102-21-17.**
**Телефон для осмотра: 044 549 44 14.**

УНП 600012389

---

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ТОРГОВ в форме аукциона

# по предоставлению права на заготовку и (или) закупку виноградной улитки (helix pomatia)

## на территории Лепельского района

Лепельский районный исполнительный комитет объявляет о проведении **25 января 2022 г. в 15.00** по адресу: 211174, Витебская область, г. Лепель, ул. Ленинская, 6, кабинет 101, торгов в форме аукциона по предоставлению права на заготовку и (или) закупку виноградной улитки (helix pomatia) на территории Лепельского района Витебской области.

**ОРГАНИЗАТОР** – Лепельский районный исполнительный комитет, 211174, Витебская область, г. Лепель, ул. Ленинская, 6, контактный телефон (802132) 34975, электронный адрес: **tat.chues@yandex.by**

**ПРЕДМЕТОМ ТОРГОВ** – право на заготовку и (или) закупку виноградной улитки (helix pomatia) на территории Лепельского района Витебской области.

В соответствии с заключением, предоставленным Национальной академии наук Беларуси, промысловый запас виноградной улитки составляет 19256 кг, предельно допустимый объем изъятия составляет 14442 кг.

**ПРОДАВЕЦ** – Лепельский районный исполнительный комитет 211174, Витебская область, г. Лепель, ул. Ленинская, 6, контактный телефон (802132) 34975.

Для участия в аукционе приглашаются юридические лица или индивидуальные предприниматели Республики Беларусь.

Участникам необходимо предоставить в комиссию по организации и проведению торгов (далее – комиссия):

- заявление на участие в аукционе;
- заверенную банком копию платежного поручения, подтверждающую внесение суммы задатка на расчетный счет организатора аукциона;
- надлежаще оформленная доверенность, в случае участия в торгах представителей юридического лица или индивидуального предпринимателя.

Документы, необходимые для участия в аукционе, принимаются комиссией по адресу: 211174, Витебская область, г. Лепель, ул. Ленинская, 6, кабинет 220 с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 в рабочие дни.

**Окончательный срок** приема документов – **19 января 2022 г. до 17.00**.

**Заключительная регистрация** участников **25 января 2022 г.** с 12.00 до 14.30.

**Начальная цена** предмета аукциона – 1450 белорусских рублей.

**Сумма задатка** – 725 белорусских рублей.

*Сумма задатка перечисляется до подачи заявления на участие в аукционе на расчетный счет организатора: BY68AKBB 36043190010252100000 в ОАО «АСБ Беларусбанк», BIC AKBBBY2X, УНП 300039625, ОКПО 040626632000, получатель платежа – Лепельский районный исполнительный комитет.*

Аукцион проводится в соответствии с Правилами добычи, заготовки и (или) закупки диких животных, не относящихся к объектам охоты и рыболовства, утвержденными постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 2 июня 2006 г. № 699.

Если аукцион признан несостоявшимся из-за того, что заявление на участие в нем подано только одним участником, предмет аукциона предоставляется этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

Лицу, выразившему согласие приобрести предмет аукциона, сумма внесенного задатка засчитывается при оплате им стоимости предмета аукциона.

Победитель аукциона (лицо, предложившее наиболее высокую цену) в течение 5 рабочих дней со дня его проведения обязан в установленном порядке перечислить на расчетный счет организатора цену, за которую продан предмет аукциона, за вычетом внесенной им суммы задатка.

Возмещение затрат на организацию и проведение торгов, в том числе расходов на изготовление и предоставление участникам документации, необходимой для их проведения, осуществляется участником, выигравшим торги. Информация о таких затратах, а также о порядке и сроках их возмещения будет доведена в день проведения аукциона до начала его проведения.

---

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

**Организатор торгов:** государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», 210015, г. Витебск, проезд Гоголя, 5, (0212) 24-63-12, +375 29 510-07-63, +375 44 709-55-52.

**Продавец:** Узденское районное потребительское общество, 223411, Минская обл., Узденский р-н, г. Узда, пер. К. Маркса, 7, тел.: +375 (1718) 60627, +375 (295) 69-19-72.

**Лот № 1.** Капитальное строение с инв. № 623/С-58962 площадью 1227,3 кв. м, наименование – торговый центр, назначение – здание специализированное иного назначения, по адресу: Минская обл., Узденский р-н, Дещенский с/с, аг. Дещенка, ул. Первомайская, 2А, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 625680204501000393 площадью 0,3164 га по адресу: Минская обл., Узденский р-н, Дещенский с/с, аг. Дещенка, ул. Первомайская, 2А (право постоянного пользования).

Обременение: договор аренды от 11.09.2018 сроком по 17.09.2023, договор аренды от 30.04.2019 сроком на 3 года.

**Нач. цена**: 586 440,00 бел. руб. с НДС.

**Задаток:** 58 644,00 бел. руб.

**Дата, время и место проведения повторного аукциона: 12.01.2022 в 14.00 по адресу: 223411, Минская обл., Узденский р-н, г. Узда, пер. К. Маркса, 7 в здании Узденского районного потребительского общества. Срок внесения задатка и подачи заявлений:** с 24.12.2021 с 8.30 по 11.01.2022 до 15.00 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга» в рабочие дни с 8.30 до 17.30. Шаг аукциона устанавливается в сумме 5 % от начальной цены лота. **Задаток перечисляется на р/с BY85 BAPB 3015 3313 9001 0000 0000 в ЦБУ № 531 г. Узда Региональной дирекции по Минской области ОАО «Белагропромбанк» БИК BAPBBY2X УНП 600109808. Получатель: Узденское райпо. Ранее опубликованное извещение: газета «Звязда» 08.10.2021, сайт bankrot.gov.by 07.10.2021.**

**Повторный аукцион проводится в соответствии с Законом Республики Беларусь от 13 июля 2012 г. № 415-З «Об экономической несостоятельности (банкротстве)». Условия повторного аукциона:** *Победитель аукциона (единственный участник аукциона, выразивший согласие на приобретение предмета аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) обязан: в течение 5 (пяти) дней со дня проведения аукциона возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы по изготовлению документации, необходимой для проведения аукциона; подписать протокол аукциона в день проведения аукциона; подписать договор купли-продажи в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона; оплатить предмет аукциона в соответствии с договором купли-продажи, но не позднее тридцати дней со дня проведения аукциона, если иной срок не установлен собранием (комитетом) кредиторов.*

Лица, желающие участвовать в торгах, обязаны подать организатору заявление на участие в торгах с приложением документов: заверенного банком документа, подтверждающего внесение суммы задатка на расчетный счет, указанный в настоящем извещении; для индивид. предпринимателя – копии свидетельства о гос. регистрации индивидуального предпринимателя; для юр. лица – доверенности, выданной представителю юр. лица (кроме случаев, когда юр. лицо представляет его руководитель), а также копии свидетельства о гос. регистрации юр. лица; для иностранного юр. лица, иностранной организации, не являющейся юр. лицом, созданной в соответствии с законодательством иностранных государств иностранным государством и его административно-территориальными единицами в лице уполномоченных органов, международной организации – легализованных в установленном порядке копий учредительных документов, выписки из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение 6 месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иного эквивалентного доказательства статуса юр.лица в соответствии с законодательством страны происхождения, документа о финансовой состоятельности, выданного обслуживающим банком; для представителя гражданина РБ, в том числе индивидуального предпринимателя, – доверенности, оформленной в соответствии с законодательством. При подаче документов на участие в торгах граждане РБ, иностранные граждане и лица без гражданства, а также граждане РБ, постоянно проживающие за пределами РБ, представители юр. лиц РБ предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность. Имущество считается проданным лицу, которое предложило на торгах самую высокую цену. В случае если торги признаны несостоявшимися, предмет торгов продается единственному участнику, подавшему заявление на участие в торгах (либо явившемуся для участия в них) при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 %. Победитель торгов в день проведения торгов подписывает протокол. Организатор торгов вправе отказаться от проведения торгов не позднее чем за один день до даты их проведения.

**Доп. информацию можно получить по тел.: (0212) 24-63-12, (029) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, marketvit.by.**

Ознакомиться с предметом торгов можно в рабочие дни по предварительному согласованию с Продавцом **по тел.: +375 (29) 277-36-96 (Куликевич Ольга Васильевна).**

---

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПЕРВЫХ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ № 2022.Б.002.00001

**Коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга»** извещает о проведении первых повторных электронных торгов по продаже имущества, принадлежащего Дочернему строительному унитарному предприятию «Передвижная механизированная колонна № 196» Минского областного производственного проектно-строительного унитарного предприятия «Минскоблсельстрой», УНП 690019088, в отношении которого открыто производство по делу об экономической несостоятельности (банкротстве) № 278-2Б/2019 в экономическом суде Минской области.

Номер лота, вид выставляемого на первые повторные электронные торги имущества:

**Лот № 1. Недвижимое имущество.**

**Информация о предмете торгов, в т. ч. место нахождения:**

капитальное строение с инв. № 613/С-13374 по адресу: Минская обл., Крупский р-н, г. Крупки, ул. Полевая, 10, площадь 43,5 кв. м, назначение – здание специализированное энергетики, наименование – здание ТП, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 623050100001002194, площадью 0,0065 га, целевое назначение – для обслуживания здания подстанции КТП (право постоянного пользования).

**Начальная цена:** 24 390,00 руб. без учета НДС (освобождение от уплаты НДС согласно п.2.30.2 ст.115 НК РБ).

**Минимальная цена:** 10 840,00 бел. руб. без учета НДС.

**Лот № 2. Недвижимое имущество.**

**Информация о предмете торгов, в т. ч. место нахождения:**

- Капитальное строение с инв. № 613/С-9517 по адресу: Минская обл., Крупский р-н, г. Крупки, ул. Московская, д. 38, площадь – 649,0 кв. м, назначение – здание административно-хозяйственное, наименование – административное здание.
- Капитальное строение с инв. № 613/С-9519 по адресу: Минская обл., Крупский р-н, г. Крупки, ул. Московская, 38, площадь – 422,0 кв. м, назначение – здание обрабатывающей промышленности иного назначения, наименование – здание арматурного цеха.
- Капитальное строение с инв. № 613/С-9520 по адресу: Минская обл., Крупский р-н, г. Крупки, ул. Московская, д. 38, площадь – 408,4 кв. м, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – здание склада, составные части и принадлежности: крыльцо, крыльцо.
- Капитальное строение с инв. № 613/С-12160 по адресу: Минская обл., Крупский р-н, г. Крупки, ул. Московская, 38, площадь – 28,4 кв. м, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – здание склада ГСМ.
- Капитальное строение с инв. № 613/С-9518 по адресу: Минская обл., Крупский р-н, г. Крупки, ул. Московская, д. 38, площадь 723,8 кв. м, назначение – здание специализированное для обработки древесины и производства изделий из дерева, включая мебель, наименование – здание столярного цеха.
- Капитальное строение с инв. № 613/С-9521 по адресу: Минская обл., Крупский р-н, г. Крупки, ул. Московская, д. 38, площадь 185,9 кв. м, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – здание склада, составные части и принадлежности: пристройка -1, пристройка – 2.
- Капитальное строение с инв. № 613/С-12158 по адресу: Минская обл., Крупский р-н, г. Крупки, ул. Московская, 38, площадь 11,8 кв. м, назначение – здание специализированное иного назначения, наименование – здание проходной.

Капитальные строения расположены на земельном участке с кадастровым номером 623050100001001935 площадью 5,2102 га по адресу: Минская обл., Крупский р-н, г. Крупки, ул. Московская, 38, целевое назначение – для обслуживания производственной базы (право постоянного пользования).

- Водонапорная башня железобетонная, площадью 9 кв. м, инв. № 114;
- Здание гаража, площадью 151,5 кв. м, инв. № 108;
- Здание компрессорной, площадью 36,6 кв. м, инв. № 48;
- Здание котельной на газу, площадью 403,6 кв. м, инв. № 676;
- Здание пропарочной камеры, площадью 140,5 кв. м, инв. № 112;
- Здание трансформаторной КТП, площадью 37,6 кв. м, инв. № 318;
- Забор 39,5 м.п. (39,5 шт.);
- Забор ж/б, инв. № 113;
- Забор м.п. 20,0 м.п (20 шт.).

Местонахождение имущества: Минская обл., Крупский р-н, г. Крупки, ул. Московская, 38.

**Начальная цена:** 614 673,59 бел. руб. без учета НДС (освобождение от уплаты НДС согласно п. 2.30.2 ст. 115 НК РБ).

**Минимальная цена:** 273 188,26 бел. руб. без учета НДС.

Размер шага составляет 5 процентов от начальной цены лота.

Имеющиеся обременения в отношении имущества – нет.

**Дата и время начала и завершения первых повторных электронных торгов: 11.01.2022 с 9.00 до 16.00.**

Первые повторные электронные торги проводятся на электронной торговой площадке Коммунального консалтингового унитарного предприятия «Витебский областной центр маркетинга» по электронному адресу http://etpvit.by.

Для участия в первых повторных электронных торгах на электронной торговой площадке по электронному адресу http://etpvit.by необходимо подать заявку на участие в электронных торгах и пройти аккредитацию в качестве участника электронных торгов, а также перечислить задаток в срок **до 16.00 10.01.2022**.

**Задаток по лоту № 1** в сумме 1219,50 (одна тысяча двести девятнадцать рублей 50 копеек) белорусских рублей, **по лоту № 2** в сумме 30733,68 (тридцать тысяч семьсот тридцать три рубля 68 копеек) белорусских рублей должен быть зачислен на счет коммунального консалтингового унитарного предприятия «Витебский областной центр маркетинга», УНП 390477566, р/с BY93MTBK30120001093300066782 в ЗАО «МТБанк» г. Минск, БИК MTBKBY22.

**Условия первых повторных электронных торгов по лотам №№ 1 и 2**: Победитель электронных торгов (единственный участник электронных торгов, выразивший согласие на приобретение предмета электронных торгов по начальной цене, увеличенной на пять процентов) обязан: в течение 5 рабочих дней со дня проведения электронных торгов возместить затраты за организацию и проведение электронных торгов, согласно сметы затрат, и оплатить услуги ЭТП согласно Прейскуранту ЭТП, заключить договор купли-продажи в течение 5 (пяти) рабочих дней со дня проведения электронных торгов; оплатить предмет электронных торгов в порядки и сроки, установленные договором купли-продажи, но не позднее 30 дней со дня проведения электронных торгов, если иной срок не установлен собранием (комитетом) кредиторов.

**Дополнительное условие по лоту № 2:** имущественные права на капитальные строения (водонапорная башня железобетонная, площадью 9 кв. м, инв. № 114, здание гаража, площадью 151,5 кв. м, инв. № 108, здание компрессорной, площадью 36,6 кв. м, инв. № 48, здание котельной на газу, площадью 403,6 кв. м, инв. № 676, здание пропарочной камеры, площадью 140,5 кв. м, инв. № 112, здание трансформаторной КТП, площадью 37,6 кв. м, инв. № 318, забор 39,5 м. п., забор ж/б инв. № 113, забор м.п. 20,0 м.п.) не зарегистрированы в установленном порядке. Государственная регистрация создания капитальных строений осуществляется в установленном порядке по заявлению покупателя на основании договора купли-продажи, решения собрания или комитета кредиторов об одобрении порядка и сроков продажи соответствующего имущества, технических паспортов, составленных по заявлению покупателя, и передаточных актов.

Победителем электронных торгов признается участник, предложивший максимальную цену за лот.

Договор купли-продажи должен быть подписан не позднее 5 рабочих дней со дня проведения электронных торгов.

Контактный телефон антикризисного управляющего +375 (17) 241-87-66.

Контактный телефон для осмотра объектов: + 375 (17) 241 87 66, +375 29 166 01 01.

Контактные телефоны лица, организующего торги на основании договора поручения: 8 (0212) 24-63-12, 8 (029) 510-07-63.

Дата, время и адрес доступа (ознакомления) с предметом электронных торгов (информацией о предмете электронных торгов – в отношении нематериальных активов) производится в рабочие дни по предварительному согласованию с Продавцом по месту нахождения имущества.

Затраты на организацию и проведение электронных торгов определяются согласно смете затрат, стоимость услуг ЭТП определяется согласно прейскуранту ЭТП. Ознакомление с затратами на организацию и проведение электронных торгов производится на **http://etpvit.by** до начала торгов.

Возмещение затрат на организацию и проведение электронных торгов осуществляется в соответствии с законодательством.

# ГАРМАТНАЕ МЯСА

## Навошта Літва загнала сябе ў кут?




**У калідорах інстытутаў Еўрапейскага саюза гавораць аб тым, што Літва лічыцца краінай з павышанай рызыкай для інвестыцый з-за абранай ёю знешняй палітыкі. Пра гэта заявіў прэзідэнт Вільнюскай асацыяцыі прамысловасці і бізнесу (VPVA) Сігітас Бесагірскас, паведаміла тэлерадыёкампанія LRT. «Ёсць палітычныя прамовы, якія трэба прамаўляць, і ёсць рэальнае жыццё, якое крыху адрозніваецца ад гэтых палітычных прамоў», — сказаў Сігітас Бесагірскас. Ён растлумачыў, што размова ідзе аб адносінах з Кітаем. Паводле яго слоў, публічныя заявы заходніх лідараў аб дзеяннях Літвы ў адносінах да Кітая не заўсёды адлюстроўваюць іх сапраўдную пазіцыю. Сігітас Бесагірскас таксама лічыць, што для прадпрымальнікаў рызыка інвестыцый у Літву павялічылася ў сувязі з тым, што знешнюю палітыку, якую праводзіць Вільнюс, стала цяжка прагназаваць. «Яны разумеюць, што Літва ўжо ідзе на занадта вялікую рызыку, і сёння існуе палітычная рызыка інвеставання ў Літву, таму што незразумела, які будзе наступны крок. Літва зараз злуецца на кітайцаў і беларусаў, а хто будзе наступны? Польшча, можа, Германія?» — задаецца пытаннем Сігітас Бесагірскас. Навошта Літва заганяе сябе ў кут?**

### АКТ ВАРОЖАСЦІ І АГРЭСІІ

«Санкцыйны закон», датычны Беларусі, які абмяркоўваецца ў Літве, з'яўляецца найгрубейшым парушэннем міжнароднага права. Аб гэтым заявіў прэс-сакратар МЗС Беларусі Анатоль Глаз. «Ужо больш за тыдзень усе мы з'яўляемся сведкамі спектакля, які разыгрываецца ў суседняй Літве вакол транзіту беларускіх калійных угнаенняў. Акцёрскае майстэрства і прадпрымальнасць некаторых удзельнікаў гэтай драмы ўражваюць. Але пакінем на водкуп самім літоўцам ацэнкі работы свайго ўрада. Унутраныя праблемы суседняй краіны — іх справа. Галоўнае, што ў гэтай каламутнай вадзе некаторыя актары пад лозунгамі салідарнасці спрабуюць пад шумок працягнуць праз парламент рашэнні, якія з'яўляюцца проста верхам бездакназнасці і цынізму. Заспакойваючы ўсіх тым, што нейкі ўнесены ў Сейм законапраект дазволіць без эканамічнай шкоды спыніць транзіт беларускіх калійных угнаенняў, на справе яны фарміруюць умовы для поўнай забароны паставак і транзіту любых беларускіх тавараў для далейшай перавозкі морам», — заявіў Анатоль Глаз.

Ён падкрэсліў: ужо сама па сабе гэта ініцыятыва з'яўляецца грубым парушэннем міжнароднага права, не лічачы шматбаковых і двухбаковых абавязацельстваў Літвы. У іх ліку — забеспячэнне бесперашкоднага транзіту тавараў, безумоўнае даванне доступу да мора дзяржаве, якая не мае выхаду да мора, што павінна максімальна забяспечвацца нават ва ўмовах надзвычайных сітуацый і ваенных дзеянняў. «Тое, што афіцыйны Вільнюс выбарачна тлумачыць нормы міжнароднага права і шчыра лічыць, што нязручныя для іх нормы можна не выконваць, — ужо ні для кога не сакрэт, асабліва пасля драмы з мігрантамі. Але ў дадзеным выпадку размова ідзе аб мэтанакіраванай спробе блакады: заблакіраваны паветраныя зносіны, абмежаваны сухапутныя, цяпер падбіраюцца да чыгуначных. Гэта ўсё ў адносінах да дзяржавы, якая не мае выхаду да мора. Што гэта, калі не акт варожасці і агрэсіі? Гэта задума таксама пагражае непасрэдна харчовай бяспецы шэрагу краін свету — імпарцёраў беларускага калію, справакуе нестабільнасць, неўраджай, рост цэн, пагоршыць праблему голаду. І усе гэтыя наступствы спакойна ўкладваюцца ў галовах літоўскіх палітыкаў», — заўважыў прэс-сакратар МЗС. — Таксама, як і тое, што ад гэтай неразумнай задумы пацерпіць іх уласнае насельніцтва. Больш за мільярд долараў беларускага экспарту і транзіту забяспечвае сёння дабрабыт не толькі Клайпедскага порта і літоўскай чыгункі. Размова ідзе ўжо пра сотні літоўскіх прадпрыемстваў і дабрабыт значнай колькасці літоўскіх сем'яў. Мы ўжо не гаворым аб пагрозе бяспецы транзіту з трэціх краін».

«Нічым іншым, акрамя бяссільнай злосці, растлумачыць гэта нельга. Ужо даўно надышоў час добра падумаць і спыніць гэтую бездакназную палітыку, якая можа не толькі дэстабілізаваць сітуацыю ў рэгіёне, але і знаходзіцца на мяжы неаб'яўленай вайны», — дадаў Анатоль Глаз.

### Даслоўна

**Раман ГАЛОЎЧАНКА, прэм'ер-міністр Беларусі: «Калі Літва спыніць транзіт, Беларусь прыме меры ў адказ»**

«Што датычыцца заяў аб магчымым спыненні транзіту беларускіх угнаенняў, мы, вядома, былі гатовыя да такога развіцця падзей зыходзячы з абсалютна хаатычнай палітыкі Літвы на беларускім напрамку. Яшчэ з мая—чэрвеня мы рыхтаваліся ў тым ліку да такога варыянта, адпрацоўвалі альтэрнатывы, — адзначыў прэм'ер-міністр Беларусі Раман Галоўчанка, паведаміла БелТА. — Калі хтосьці ў Літве лічыць, што гэта нанясе нейкую шкоду Беларусі, то магу з усёй адказнасцю заявіць, што галоўная шкода будзе нанесена самой Літве. Вось такую самую шкоду краіна нанесла сабе палітычнай адмовай ад куплі беларускай электраэнергіі, якая абышлася б Літве як мінімум удвая танней за той узровень, па якім яны купляюць цяпер на аптовым рынку».

Прэм'ер-міністр падкрэсліў, што калі Літва спыніць транзіт беларускіх угнаенняў, гэта будзе парушэннем усіх міжнародных абавязацельстваў. «Мы гэта без адказу не пакінем. Нам давядзецца прымаць меры ў адказ. Як вы ведаеце, беларускі экспарт у Літву складае каля $1 млрд, але ў асноўным гэта сыравіна і матэрыялы, якія набываюць літоўскія кампаніі для наступнай перапрацоўкі. Гэта датычыцца прадукцыі дрэваапрацоўкі, палімераў і гэтак далей. Калі мы спынім пастаўкі гэтых тавараў, пераарыентуем іх на іншыя рынкі, няхай літоўскі бізнес спытае ў свайго ўрада, як ён будзе вырашаць іх праблемы», — заявіў прэм'ер. — Тым не менш мы ўсё ж такі мяркуем, што здаровы сэнс пераможа».

### ПАГРОЗА БЯСПЕЦЫ

З адпаведнымі ацэнкамі дзеянняў Вільнюса рэзка выступіў расійскі бок. Магчымая забарона Літвы на транзіт грузаў з Беларусі не застанецца без увагі Расіі. Пра гэта гаворыцца ў каментарыі афіцыйнага прадстаўніка МЗС РФ Марыі Захаравай, апублікаваным на сайце расійскага знешнепалітычнага ведамства. «З крайняй занепакоенасцю ўспрынялі інфармацыю аб магчымай забароне транзіту праз Літву грузаў з Беларусі, — гаворыцца ў каментарыі. — Пераканаiныя, што такі шлях з'яўляецца тупіковым, паколькі можа закрануць забеспячэнне Калінінградскай вобласці, негатыўна адбіцца на эканоміцы, сацыяльным становішчы і якасці жыцця насельніцтва гэтага рэгіёна Расійскай Федэрацыі». Афіцыйны прадстаўнік расійскага знешнепалітычнага ведамства заклікала літоўскі бок не ісці па шляху падрыву эканамічных сувязяў, а зрабіць усё магчымае для нармалізацыі абстаноўкі і выканання ў поўным аб'ёме міжнародных абавязацельстваў.

Губернатар Калінінградскай вобласці Антон Аліханаў занепакоены ініцыятывай Літвы абмежаваць транзіт грузаў з Беларусі, бо Калінінград спажывае беларускія прадукты. Аб гэтым ён заявіў у інтэрв'ю РІА «Навіны». Антон Аліханаў заўважыў, што бачыць у магчымым рашэнні Літвы пагрозу не толькі харчовай, але і эканамічнай бяспецы рэгіёна. «Я лічу, што абмежаванне гэтых перавозак не павінна ўвогуле ніколі ўводзіцца і нават разглядацца, таму што гэта ўжо не адносіны Літвы і Беларусі ці яшчэ кагосьці — гэта адносіны з Расіяй. І тут трэба адпаведныя выключэнні прадугледжваць, калі яны будуць нешта ў сябе абмяжоўваць», — сказаў губернатар. Ён дадаў, што ўлады рэгіёна вельмі пільна адсочваюць сітуацыю. «Лічым, што трэба нагадваць нашым суседзям, што яны павінны забяспечваць свабоду транзіту, аб якой мы дамаўляліся», — падкрэсліў Антон Аліханаў.

### ШМАТМІЛЬЯРДНЫЯ ІСКІ

Беларускія калійныя ўгнаенні — стратэгічны прадукт для найбуйнейшага ў Літве порта. Акрамя таго, сам «Беларуськалій», які трапіў пад санкцыі, валодае 13 % акцый партовага тэрмінала навалачных грузаў. Порт ужо паведаміў аб скарачэнні некалькіх дзясяткаў работнікаў, і гэта толькі пачатак, упэўнены кіраўнік прадпрыемства. «Уся наша ўвага павінна быць засяроджана на тым, каб так ці інакш кампенсаваць аб'ёмы грузу. Кампенсаваць 30 працэнтаў, калі адбудзецца страта, за такі кароткі перыяд проста немагчыма», — лічыць генеральны дырэктар Клайпедскага порта Альгіс Латакас. Кошт кантракта з беларускай кампаніяй складае каля 60 мільёнаў еўра ў год. І ён ужо падпісаны да 2023-га. Для параўнання: чысты прыбытак Lietuvos gelezinkeliai (Літоўская чыгунка) за мінулы год склаў 36 мільёнаў. А разрыў пагаднення з «Беларуськаліем» пагражае яшчэ і мільярднымі штрафамі.

Прыпыненне Літвой транзіту беларускіх угнаенняў пацягне за сабой падачу іскаў супраць краіны не толькі з боку беларускіх



кампаній, але і з боку пакупнікоў угнаенняў, заявіла афіцыйны прадстаўнік «Беларускай калійнай кампаніі» (БКК, трэйдар «Беларуськалія») Ірына Саўчанка ў інтэрв'ю літоўскай радыёстанцыі LRT. Акрамя таго, паводле яе слоў, Беларусь адрэагуе на дзеянні балтыйскай дзяржавы аналагічнымі мерамі — спыніць транзіт у Літву. «У выпадку парушэння Літвой міжнародных пагадненняў мы скарыстаемся ўсімі сродкамі прававой абароны і пададзім іскі ў суды. Акрамя таго, мы мяркуем, што ў суд звернецца і большасць нашых кліентаў — пакупнікоў угнаенняў, якія застануцца без тавараў і панясуць значную шкоду з-за дзеянняў Літвы. У выніку яны могуць быць вымушаныя купляць угнаенні па значна больш высокіх цэнах. Сумы судовых іскаў па гэтай справе могуць дасягаць мільярдаў еўра», — дадала Саўчанка.

«Але ёсць і яшчэ адзін момант. У выпадку невыканання Літвой сваіх міжнародных абавязацельстваў Беларусь будзе вымушана прыняць меры ў адказ, бо ваша краіна таксама з'яўляецца транзітнай дзяржавай», — сказала яна. Прадстаўнік БКК падкрэсліла, што санкцыі ЗША супраць «Беларуськалія» не даюць Lietuvos gelezinkeliai прававых падстаў для прыпынення аперацый і адмовы ад перавозкі угнаенняў.

### У ПОШУКАХ «СТРЭЛАЧНІКА»

Але афіцыйны Вільнюс думае перш за ўсё не аб партавіках і чыгуначніках, а аб уласнай рэпутацыі ў вачах амерыканскіх партнёраў. «Мая асабістая пазіцыя і пазіцыя ўрада вельмі ясныя: угнаенні «Беларуськалія» пасля ўвядзення санкцый ЗША не могуць праходзіць праз Літву. Тут няма ніякай двухсэнсоўнасці», — заявіў кіраўнік літоўскага Мінтранса Марус Скуадзіс.

Міністр транспарту, міністр замежных спраў і прэм'ер па чарзе пагражалі пайсці ў адстаўку, нібыта каб узяць на сябе адказнасць за крызіс. Але ў выніку вінаватым прызначылі дырэктара камерцыйнай Lietuvos gelezinkeliai Мантаса Бартушку. «Цяпер складваецца такое ўстойлівае ўражанне, у тым ліку ў літоўскай апазіцыі, што проста ўлады спрабуюць зняць з сябе адказнасць і перанесці яе, а прасцей кажучы, знайсці стрэлачніка ў асобе эканамічных суб'ектаў», — адзначыў vesti.ru палітолаг Вадзім Валавы.

Літве няма сэнсу спыняць транзіт прадукцыі «Беларуськалія», заявіў дэпутат Сейма Гінтаўтас Палуцкас, паведаміла РІА «Навіны». «Калі цяпер, пасля ўсіх гэтых высвятленняў, урад узяў бы і сказаў: "Глядзіце, усё ў парадку, мы ўсё ўзважылі, але крыху перагнулі палку, і ўгнаенні будуць вазіць», я нават сказаў бы, што гэта разумныя паводзіны. Таму што сапраўды няма сэнсу мучыць сябе і сваё грамадства, асабліва калі гэтыя санкцыі вельмі лёгка абысці», — сказаў Гінтаўтас Палуцкас. Акрамя таго, ён заклікаў асудзіў прапанову Мінтранса забараніць транзіт. «Мы бачым прапановы Міністэрства транспарту, законапраекты, у якіх забараняецца ўвесь транзіт, імпарт тавараў і паслуг з Беларусі. Гэта зусім неадэкватны адказ на цяперашнюю сітуацыю», — заўважыў парламентарый.

Літва па загадзе заакіянскага гаспадара павінна сама сабе перакрыць кісларод, заўважыў Baltnews. Самае смешнае ў тым, што ў тэксце дакумента, які быў апублікаваны на сайце Сейма, сказана, што «папраўкі накіраваны на стварэнне ўмоў для эфектыўнага забеспячэння інтарэсаў нацыянальнай бяспекі Літвы». «Вось такое арыгінальнае разуменне інтарэсаў нацыянальнай бяспекі. Аказваецца, яно заключаецца ў нанясенні ўрону ўласнай эканоміцы. Пытанне, а хто даў права Захаду вырашаць, якой краіне ён можа дазволіць развівацца, а якую можа па ўласным жаданні задушыць, гэтымі палітыканамі нават не ўзнімаецца. За апошнія дзесяцігоддзі яны міжнароднае права звялі на ўзровень банальнага закону джунгляў, дзе моцны мае поўнае права есці слабага», — адзначыў Baltnews.

### ГЛУПСТВА — БЯЗМЕЖНАЕ

«Калі літоўскі бок не выправіць свае памылкі, а замест гэтага толькі працягне ўхіляцца ад уласнай адказнасці, то ўсё гэта толькі пагоршыць адносіны паміж дзвюма краінамі. У выніку менавіта Літва панясе большую шкоду», — пракаментаваў дзеянні Вільнюса ў дачыненні да Паднябеснай прадстаўнік Міністэрства замежных спраў Кітая Ванг Венбін. І жорсткі адказ з боку Пекіна не прымусіў сябе чакаць. Пасля ўсіх літоўскіх дэмаршаў кітайская мытня выдаліла Літву са сваёй IT-сістэмы, фактычна заблакіраваўшы ўвесь літоўскі экспарт на кітайскі рынак. «Кітай вырашыў не проста перакрыць гандаль з Літвой, але і зрабіць усё для таго, каб максімальна ўскладніць эканамічныя адносіны кампаній з Літвой. Мне падаецца, гэта вялікая праблема і правал знешняй палітыкі дзяржавы», — падкрэсліў Вадзім Валавы.

Літва, якая апынулася ў няпростай сітуацыі пасля сваіх правакацый, атрымала высокую «ўзнагароду» ад ЗША — тытул рэгіянальнага «маяка дэмакратыі», заўважыла кітайская газета Global Times. Як мяркуе аўтар артыкула выданне, для Штатаў і Літва, і «дэмакратыя» — усяго толькі інструменты, якімі можна дамагацца жаданага. За выключэннем пустых прыемных слоў у адрас маленькіх краін, якія не думаюць сваім розумам, Вашынгтон наўрад ці можа прапанаваць ім нейкую рэальную дапамогу. «Якую б краіну ці рэгіён ЗША ні ахрысцілі як «маяк дэмакратыі», яны, па сутнасці, у рэшце рэшт стануць для Амерыкі гарматным мясам. Ці то Грузія, Украіна, Туніс, ці Блізкі Усход, дзе ЗША прасоўваюць дэмакратыю, гэтыя месцы сутыкнуцца з хаосам, звяржэннем урадаў, застоямі ў развіцці і пакутамі простых людзей», — упэўнена выданне. Global Times сцвярджае, што Літва — «чарговае гарматнае мяса, якое не занадта шмат каштуе ў вачах ЗША». На жаль, Вільнюс лічыць гонарам, што Вашынгтон ім карыстаецца, а Амерыцы гэта толькі на руку.

«Беларусі ёсць чым адказаць і на вар'яцкія эканамічныя санкцыі, — адзначыў Baltnews. — Сёння калектыўны Захад на ўласным прыкладзе чарговы раз пераканаўча даказаў усяму свету, што калі розум і мае свае межы, то глупства — бязмежнае».

**Пётр ДУНЬКО.**

# «Я — ЗАЎЗЯТАЯ ПАТРЫЁТКА...»

## КАЦЯРЫНА МУЗЫЧЭНКА ПРА ЛЮБІМУЮ РАБОТУ, СЯМ'Ю І НОВЫ ГОД

**Начальнік галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы і па справах моладзі Магілёўскага аблвыканкама Кацярына МУЗЫЧЭНКА — жанчына валявая і прынцыповая. Сам лёс распарадзіўся так, каб яна стала галоўным ідэолагам вобласці. Але нават калі б яна працавала не ў дзяржапараце, а ў любым іншым месцы, усё роўна была б лідарам, бо ў сваёй рабоце заўсёды прытрымліваецца цвёрдай грамадзянскай пазіцыі і валодае абвостраным пачуццём справядлівасці. Кажа, што самае горшае для чалавека — здрадзіць свайму народу і Айчыне. Асабіста яна гатова зрабіць усё для таго, каб дзяржава заставалася ў моцных і надзейных руках. У размове з карэспандэнтам «Звязды» Кацярына Музычэнка падзялілася прыватнымі эпізодамі са свайго жыцця і расказала, пра што марыць.**



### Сельскай працы не баюся, але ідэалогія — гэта маё

**Кацярына Музычэнка ў органах дзяржаўнай улады працуе амаль чвэрць стагоддзя. Прызнаецца, што ўжо нават і не ўяўляе сябе на іншым месцы. Мала хто ведае, што быў перыяд, калі галоўны ідэолаг вобласці прымярала на сябе будучыню вучонага-агранома. Менавіта такая спецыяльнасць стаіць у яе дыпломе аб заканчэнні Беларускай сельскагаспадарчай акадэміі ў Горках.**

— Гэта быў апошні выпуск з такой спецыяльнасцю на аддзяленні «Аграхімія і глебазнаўства», — успамінае яна. — У акадэмію паступіла пасля Дрыбінскай сярэдняй школы, якую скончыла з медалём. Меркавалася, што працаваць буду ў сельскай гаспадарцы, але туды так і не трапіла. Хоць сельскай працы не баюся. У свой час даіла дзве каровы — бацькоў і сваёй свекрыві.

***— Напэўна, бацькі працавалі ў сельскай гаспадарцы?***

— Мае бацькі — сельская інтэлігенцыя, абодва медыкі. Маці родам з Екацерынбурга, а тата з вёскі Трылесіна Дрыбінскага раёна (тады ён быў Горацкі). Бацька скончыў Першы Ленінградскі медыцынскі інстытут імя Паўлава і быў накіраваны на Урал на Беларускую атамную станцыю, дзе і сустрэў маю маці. Там яны ажаніліся і нарадзілі маіх брата і сястру. Яна пачала хварэць, і бацькам параілі змяніць клімат. Яны вырашылі ехаць у Дрыбін. Тата 18 гадоў быў галоўным урачом раённай бальніцы. Тут я і нарадзілася. Дарэчы, тата асабіста прымаў роды. Наогул ён прысутнічаў пры нараджэнні ўсіх сваіх дзяцей. Вельмі трапятліва адносіўся да нас.

Мой брат старэйшы за мяне на 20 гадоў, сястра — на 10. Я нарадзілася, калі бацькі былі ў дастаткова сталым узросце. Яны вельмі любілі адзін аднаго. Маці няма ўжо дзесяць гадоў, бацькі — тры. На жаль, нядаўна пайшоў з жыцця старэйшы брат. Засталіся мы з сястрой.

***— А як вы трапілі на работу ў дзяржапарат?***

— Так зоркі сышліся. Дрыбінскі раён унікальны тым, што стварыўся тройчы. Трэці раз — у канцы 80-х. На той момант у райвыканкам быў патрэбны вядучы спецыяліст жыллёва-камунальнага аддзела. Мне, як пачаткоўцу, прысвоілі самы ніжэйшы клас дзяржслужачага — дванаццаты. Зараз маю ўжо другі.

За амаль 25 гадоў работы ў дзяржапараце змяніла некалькі пасад. У Дрыбінскім райвыканкаме працавала галоўным спецыялістам па рабоце з насельніцтвам, пацярпелым ад аварыі на ЧАЭС, потым — начальнікам аддзела па справах моладзі, затым узначаліла аддзел ідэалагічнай работы. За гэты перыяд паспела на год сыходзіць у дэкрэтны адпачынак. Нарадзіла сына Мілана і праз год выйшла на работу. Час быў вельмі нестабільны, хацелася прыносіць карысць краіне, удзельнічаць у яе лёсе.

> **«Я вельмі творчы чалавек. Крыху іграю на піяніна, крыху малюю, спяваю, танцую — усяго пакрысе. Нас бацькі выхоўвалі ўсебакова развітымі».**

Я вельмі заўзятая патрыётка, змагар за справядлівасць. Таму знайшла для сына няню і з галавой паглыбілася ў работу. Наступнае прызначэнне было на пасаду намесніка старшыні Клімавіцкага раёна па сацыяльных пытаннях, там я адпрацавала пяць гадоў. Падчас работы скончыла Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце (кваліфікацыя «Кіраванне сацыяльнай сферай»). А ўжо з Клімавіч мяне накіравалі ў Магілёў начальнікам тады яшчэ галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі аблвыканкама.

### Кожны павінен вызначыцца, на чыім ён баку

***— Наколькі важную ролю ў грамадстве іграе ідэалогія? Якая галоўная задача ідэолага ў рабоце з насельніцтвам?***

— Я выхавана так, што павінна дапамагаць іншым. Самая высокая адзнака — адзнака людзей. Чым ты ім дапамог, што для іх зрабіў. Ідэалогія гэта таксама дэкларуе. Лічу, што тая каманда, якую я ўзначальваю, моцная, у яе складзе выключна вопытныя людзі, за плячыма якіх шмат гадоў дзяржаўнай службы. Іншага ўжо сабе і не ўяўляем. Усе падзеі, якія адбываліся ў краіне, маральна давалі ся цяжка. Ідэолагі, міліцыя, служба дзяржбяспекі праявілі сябе як адданыя радзіме і існуючай уладзе сілы. На жаль, пра ўсіх такога не скажаш. Але мы выстаялі і выстаім далей, краіну ніхто нікому не аддасць. І мы павінны разумець, што гэта атрымалася толькі дзякуючы нашаму Прэзідэнту. Калі б не яго характар і мудрасць, нас бы сцерлі з аблічча зямлі.

Не хочацца сыходзіць у палітычную тэму, шмат было сказана і напісана пра мінулы год, але без гэтага. Магілёўская вобласць першая зрабіла вялікі мітынг у падтрымку свайго земляка. І ў Мінск паехалі з расцяжкай: «Гераічная Магілёўшчына — за бацьку-земляка». Успамінаю момант: калі мітынг скончыўся, нашы дэлегацыі ўжо раз'ехаліся, а мы, некалькі чалавек з аблвыканкама, са сваёй расцяжкай і ў адзенні з дзяржаўнай сімволікай трапілі ў самую гушчу апазіцыйна настроенага натоўпу. Насустрач ішлі людзі з бела-чырвонымі сцягамі, некаторыя ехалі нават на конях. Мы разумелі, што магло быць сутыкненне, але ніхто з нас не зняў чырвона-зялёную кепку, не згарнуў расцяжку. Пасля гэтага я пераканалася, што Магілёўская вобласць ніколі не скруціць расцяжку за бацьку-земляка. Мы 26 гадоў жылі як за надзейнай сцяной пры нашым Прэзідэнце, не думалі пра палітыку, бо ў краіне быў дабрабыт і спакой. Нікога асабліва не цікавіла, што адбываецца ў свеце. І атрымалася, што вырасла палітычна не падрыхтаванае пакаленне.

У галаве не ўкладваецца, як гэта наша моладзь магла здрадзіць? Лічу, што тыя меры, якія прынятыя па недапушчэнні знявагі існуючых сімвалаў дзяржаўнасці, правільныя. І сёння кожны павінен вызначыцца, на чыім ён баку. Мы разбіраемся, у чым прычына, якая сапраўдная пазіцыя ў чалавека, нельга ўсіх агулам пад адзін грэбень раўняць. Пра гэта кажа і наш Прэзідэнт. Работы шмат, хутка будзем абмяркоўваць праект Канстытуцыі, сустракацца з людзьмі, даваць магчымасць азнаёміцца з галоўным дакументам краіны кожнаму.

***— Сёння да ўлады прыходзяць маладыя людзі. Што трэба для таго, каб яны адчувалі адказнасць перад сваім народам?***

— Работа дзяржаўная — вельмі сур'ёзная рэч. Зыходзячы са свайго 25-гадовага стажу, хачу адзначыць, што вельмі правільна не адразу назначаць на вялікія пасады і месцы, а даць магчымасць паступова прайсці ўсе прыступкі. Тады будзеш добра ведаць, чым жывуць людзі і чаго яны чакаюць.

***— Напэўна, пры такой адказнай рабоце, як ваша, мала застаецца часу на сябе і сям'ю. Дачка і сын не скардзяцца на недахоп увагі?***

— Работа — стыль майго жыцця, яна сапраўды патрабуе шмат сіл, увагі і часу. Сям'я, на жаль, ад гэтага церпіць. І дзеці мне пра гэта пастаянна нагадваюць. Маўляў, не хапае ім мяне. І ёсць адчуванне, што я ім нешта недадала.

Дачка ўжо самастойная, нядаўна выйшла замуж за свайго сябра з Клімавіч, жывуць у Мінску. Ён — афіцэр атрада спецпрызначэння МНС «Зубр», а яна — музыкант. Сыну яшчэ 13 гадоў. Ён вучыцца ў сёмым класе, займаецца каратэ, захапляецца футболам, камп'ютарнымі гульнямі. Вельмі актыўны, пазітыўны і паглыблены ў ідэалогію беларускай дзяржавы. Калі рыхтуецца да інфармацыйнага часу, просіць дапамогі. Сам прыдумвае тэмы. У інтэрнэце шмат рознага, але ён навучыўся ставіць фільтравальны кантэнт. Калі яго нешта чапляе, вывучае некалькі крыніц.

У нас наогул усе ў сям'і прасякнутыя ідэалогіяй: і сын, і дачка, і сястра, і астатнія сваякі. Сястра для мяне — наогул вялікі аўтарытэт. Пасля таго, як сышлі з жыцця мае бацькі і брат, яна мне і сястра, і маці, і сяброўка. Мы не можам адна без адной, у нас вельмі трывалая сувязь.

### Лепей лякарства, чым бацькоўскі дом, няма

***— А з малой радзімай засталіся якія-небудзь сувязі?***

— З Дрыбінскім раёнам сувязь не перарываецца, там засталася бацькоўская хата. І яна не прадаецца. Прыязджаем туды з сястрой на выхадныя, а летам саджаем агарод. Гэта наша аддушына, там нават лягчэй дыхаецца. Работа напружаная, грамадска-палітычная сітуацыя ў краіне складаная, у сям'і бываюць вострыя моманты, і лепей лякарства, чым бацькоўскі дом, няма.

Зрабілі там рамонт і вырашылі з сястрой жыць у гэтым доме на пенсіі. Там усе свае. І жыхары ветлівыя. Наогул, Магілёўскай вобласці пашчасціла з добрымі людзьмі.

***— Ці застаецца пасля работы час для сябе? Чаму яго прысвячаеце?***

— Вельмі люблю займацца дызайнерскімі рэчамі. Пачала рабіць вяночкі да Новага года. Вельмі падабаецца сам працэс, і лічу, што ў мяне нядрэнна атрымліваецца. Люблю, каб у доме было ўтульна і прыгожа. Акрамя гэтага, у мяне ёсць невялічкі агародзік. Сёлета на ім сабрала вялікі ўраджай таматаў. Сама праполваю, паліваю, раблю закруткі на зіму. У мяне ёсць вялікая кніга яшчэ з матулінымі рэцэптамі, дапісваю туды свае і сястры, потым перадам дачцэ.

Наогул, я вельмі творчы чалавек. Крыху іграю на піяніна, крыху малюю, спяваю, танцую — усяго пакрысе. Нас бацькі выхоўвалі ўсебакова развітымі. Наша маці грала на гітары, баяне, гармоніку, фартэпіяна, не маючы музычнай адукацыі. Мая сястра піша карціны, вельмі цікавыя. У бацькоўскім доме ў яе ёсць асабістая майстэрня.

***— Шмат хто не можа ўявіць сабе адпачынак без мора, сонейка, падарожжаў. А для вас які адпачынак лепшы?***

— Адпачываць люблю дома. Лепш адпачынку, чым у Беларусі, няма нідзе. У нас унікальныя мясціны. Цяпер у школах рэалізоўваецца праект «Мая зямля — Прыдняпроўе». Ведаеце, для чаго ён? Мы дажыліся да таго, што не ведаем, хто нашы суседзі, якія ў нас ёсць помнікі, каму яны прысвечаны, у гонар каго названы вуліцы, якія ў нас прадпрыемствы, героі. Мэта праекта — вывучэнне роднага краю.

***— Якія людзі з'яўляюцца для вас прыкладам для пераймання? Чаму вы ў іх вучыцеся?***

— Мне заўсёды шчасціла з кіраўнікамі. Гэта мае настаўнікі. Былыя старшыні Дрыбінскага і Клімавіцкага раёнаў у перыяд маёй работы Віктар Гушча і Васілій Захарэнка, намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкама Валерый Малашка, першы намеснік міністра інфармацыі Андрэй Кунцэвіч, былы памочнік Прэзідэнта, галоўны інспектар па Магілёўскай вобласці Генадзь Лаўранкоў, былы старшыня Магілёўскага аблвыканкама, а цяпер намеснік старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі Леанід Заяц. Гэта тыя людзі, у якіх я шмат чаму вучуся. Ва ўсіх іх моцная любоў да Магілёўшчыны. Усе яны вельмі інтэлігентныя, правільна выхаваныя.

### А як жа без «Аліўе»?

***— Напярэдадні навагодніх святаў. Якія б падзеі ні адбываліся, наколькі б цяжкім ні было становішча, але Новы год прыходзіць. А з ім — новыя надзеі, адчуванні, змены. Як збіраецеся сустракаць Новы год і што чакаеце ад яго?***

— У дзяцінстве ў нас заўсёды была традыцыя ўсёй сям'ёй ехаць у лес, выбіраць ёлку. Прывозілі, ставілі, упрыгожвалі. Дагэтуль і для мяне, і для дзяцей упрыгожыць ёлку — падзея. Звычайна робім гэта ў 20-х чыслах снежня, але сёлета паставілі загадзя. Купілі штучную вышынёй 2,5 метра, для паху паставім яловыя галінкі. Робім вяночкі, гірлянды, уключаем ілюмінацыю ва ўсім доме. Ад бацькоў засталася скрыня з навагоднімі цацкамі савецкага перыяду — шкляныя зорачкамі, зайчыкамі, гадзіннікам. Вешаем іх на самае пачэснае месца.

Нядаўна ў інтэрнэце трапіла на вочы выказванне наконт таго, што пачаўся пераднавагодні абмен шэдэўральнымі рэцэптамі салатаў, але 31 снежня мы ўсе нарэжам «Аліўе». І гэта так. Без традыцыйнага «Аліўе» аднаназначна справа не абыдзецца. Мандарыны, шампанскае, «Аліўе», мяса запечанае, торт — усё гэта абавязкова будзе на нашым сямейным святочным стале.

Апошнія два гады былі вельмі цяжкія для краіны. Спадзяюся, што наступны год будзе лепшы, гляджу ў яго з надзеяй. Кожны дарослы ў душы дзіця, мы ўсе верым у цуды, хоць не кожны пра гэта кажа. Спрадвеку загадваем жаданні і спадзяёмся на пасяховае шчаснае жыццё. І сваё, і родных, і краіны. Калі краіне будзе кепска, усім нам аднаназначна будзе дрэнна.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

# ЧЫРВОНКА
ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА

23 СНЕЖНЯ 2021 г.
ЧАЦВЕР
№ 24 (15923)

Выдаецца з 21 красавіка 1921 года


Імёны

## Павел ГЛІНЧУК:

# «Траўмы — гэта рабочыя моманты»



**У снежні прынята падводзіць вынікі года, даваць яму ацэнку, будаваць планы на наступны. У спорце гэта вельмі важная навагодняя традыцыя. Для беларускай барацьбы 2021-ы выдаўся даволі паспяховым. Тры медалі на Алімпійскіх гульнях у Токіа, вядома, самае важнае дасягненне. Але на працягу ўсяго года беларускія барцы не сыходзілі з п'едэсталаў міжнародных турніраў і спартыўных навін. Сярод іх — Павел Глінчук. Барацьбе 20-гадовы спартсмен прысвяціў большую частку свайго жыцця — 13 гадоў. Як гэта, змагацца ўвесь гэты час, ён расказаў «Чырвонцы. Чырвонай змене».**

***— У гэтым сезоне ты стаў чэмпіёнам свету сярод юніёраў, затым заваяваў «бронзу» юніёрскага чэмпіянату свету. Дай ацэнку такому паспяховаму сезону?***

— Ён сапраўды атрымаўся добрым, але не ўсё задуманае ўдалося выканаць. Планавалі выйграць чэмпіянат Еўропы сярод юніёраў і чэмпіянат свету. Але ў мяне яшчэ ёсць два гады, каб выйграць маладзёжныя чэмпіянаты свету і Еўропы. Для нас з трэнерамі было важна добра выступіць на юніёрскіх турнірах, паколькі я завяршаю выступленне на гэтым узроўні. Чэмпіянат Еўропы выйграць не ўдалося, а на чэмпіянаце свету, дзякуй богу, усё было добра. Гульні СНД, дзе я таксама ўзяў «золата», сталі маімі апошнімі спаборніцтвамі на юніёрскім узроўні. Мне не страшна пераходзіць на дарослы ўзровень. Я ўжо ўдзельнічаў у такіх турнірах, займаў прызавыя месцы. Псіхалагічна я гатовы. Думаю, усё будзе нармальна.

***— На маладзёжным чэмпіянаце свету ты ўсе схваткі выйграў заўчасна. Гэта такая тактыка?***

— У мяне была ўстаноўка трэнера: старацца заўчасна скончыць усе схваткі. На чэмпіянаце было шмат паядынкаў, і каб захоўваць сілы на наступны, трэба было спраўляцца менавіта так. Мы планавалі такі сцэнарый, і ўсё добра склалася. У нейкай ступені нават пашанцавала. У мяне часта атрымліваецца заўчасна скончыць схватку. Я люблю рабіць кідкі і не люблю штурхацца. Хачу адразу выціснуць максімум ад схваткі. Зразумела, што з мацнейшым сапернікам гэта складаней. І, рыхтуючыся да выступленняў на дарослым узроўні, улічваю гэта. Але там менш схватак, і я настройваюся выціскаць з паядынка максімум ды паказваць прыгожую барацьбу.

*(Заканчэнне на 4-й стар. «ЧЗ».)*

Не вучобай адзінай

# Прафесійныя кампетэнцыі і чалавечыя каштоўнасці

### У чым сакрэт папулярнасці студатрадаўскага руху?

**Па выніках Рэспубліканскага конкурсу «Працоўны семестр» у намінацыі «Пераходны сцяг найлепшаму студэнцкаму атраду» зноў перамог будаўнічы атрад «Эўрыка» з Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта. Гэта, дарэчы, ужо пятая іх перамога ў адмысловым спаборніцтве. Будатрад, які стаў амаль легендарным, працаваў у Астраўцы на Усебеларускай маладзёжнай будоўлі «Горад маладосці».**

*(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)*




Свая атмасфера

# КАНСТРУКТАР ЯК СУСВЕТ

### Ім ён можа быць і для малечы, і для дарослых

**У сучасным свеце, калі грамадства паглынаюць інфармацыйны прагрэс і найноўшыя тэхналогіі, складана захапіць дзіця якой-небудзь цацкай, не кажучы ўжо пра дарослых. Аднак Надзея Салаўёва са сваім мужам здолелі стварыць такое месца, дзе кожны ахвотны можа паглыбіцца ў дзяцінства, пагуляць у LEGO і ацаніць калекцыю, якая дзякуючы сваім маштабам трапіла ў Кнігу рэкордаў Гінеса.**



— Ідэя стварыць музей LEGO ўзнікла ў сям'і дзякуючы нашым дзецям: пятнаццацігадоваму Арцёму і васьмігадовай Марыі. Мы заўважылі ў іх цікавасць да канструктара і, разумеючы, што гэта не проста цацка, а досыць карысная рэч, якая развівае дробную маторыку, пачалі купляць ім усё больш набораў. Аднойчы муж з сынам пабудавалі цэлы горад з іх, нам гэта так спадабалася, што мы вырашылі зрабіць такі ж, толькі ў вялікіх маштабах. Неўзабаве ў нас дома перастала хапаць месца для канструктара. *(Смяецца.)* З гэтага і пачаўся шлях да стварэння нашай сямейнай калекцыі, якая ў хуткім часе ператварылася ў сапраўдны музей.

Наша гераіня тлумачыць, што музей «сямейны» не толькі таму што ўся калекцыя была створана членамі адной сям'і, але і таму што ён будзе цікавы як малодшаму пакаленню, так і старэйшаму. Для дзяцей у ім ёсць гульнявыя зоны, кансольны пакой. А дарослым будзе цікава і карысна даведацца пра гісторыю кампаніі LEGO.

*(Заканчэнне на 3-й стар. «ЧЗ».)*

# Прафесійныя кампетэнцыі і чалавечыя каштоўнасці

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

— Узнагароджанне пераможцаў конкурсу «Працоўны семестр» адбылося ў рамках фіналу рэспубліканскага марафону студэнцкіх атрадаў «Маладосць. Праца. Адзінства», прысвечанага Году народнага адзінства. Сёлета была працаўладкавана рэкордная колькасць маладых людзей — больш як 33,5 тысячы хлопцаў і дзяўчат ва ўзросце ад 14 да 31 года, — з гонарам кажа **камандзір Рэспубліканскага штаба студэнцкіх атрадаў БРСМ Надзея ШАХОЎСКАЯ**. — Дзейнічалі 2383 студэнцкія атрады розных профіляў: будаўнічыя, педагагічныя, сэрвісныя, сельскагаспадарчыя, медыцынскія, вытворчыя...

Мы рэалізавалі шэраг рэспубліканскіх маладзёжных працоўных праектаў, сярод якіх будаўнічы — «Горад маладосці» (Усебеларуская маладзёжная будоўля ў Астраўцы), сельскагаспадарчы — «Талачын» на базе Талачынскага кансервавага завода, вытворчы — «Атлант-2021». Статус абласной (гарадской) маладзёжнай будоўлі ў 2021 годзе атрымалі будаўніцтва шматфункцыянальнага медыцынскага цэнтра ў Брэсце, сярэдняй школы ў мікраёне № 96 Гомеля, кардыятэрапеўтычнага корпуса на тэрыторыі Магілёўскай абласной клінічнай бальніцы, рэканструкцыя корпуса кадэцкага вучылішча ў Полацку і рэканструкцыя вуліцы Гагарына ў Віцебску, комплексу будынкаў Гарадской клінічнай бальніцы № 3 у Гродне.

Акрамя «Эўрыкі», яшчэ два атрады з Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта занялі сёлета лідзіруючыя пазіцыі. Сярод будаўнічых атрадаў першынство ў рэспубліканскім конкурсе заваяваў атрад «Рытм», а таксама атрад «Дойліды» з гэтай жа ВНУ. Апошні працаваў на Міжнароднай студэнцкай будоўлі «Кузбас-300» у расійскім Кемераве і стаў там найлепшым. Беларускія студэнты разам з расійскімі і казахскім будатрадамі ўдзельнічалі ва ўзвядзенні спартыўных і сацыяльных аб'ектаў капітальнага будаўніцтва Кузбаса. На міжнароднай будоўлі сабраліся 18 атрадаў, канкурэнцыя была вельмі сур'ёзная...



У намінацыі «Найлепшы педагагічны атрад» перамогу святкавалі студэнцкія атрады «Новае пакаленне» Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. С. Пушкіна і «Сузор'е» Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка, у намінацыі «Найлепшы сельскагаспадарчы атрад» — атрады «Пушчанцы» тэрытарыяльнага штаба студэнцкіх атрадаў Камянецкай раённай арганізацыі БРСМ і «Парэчанка» Гродзенскага дзяржаўнага аграрнага ўніверсітэта.

Першымі ў намінацыі «Найлепшы экалагічны атрад» прызнаныя студэнцкі атрад тэрытарыяльнага штаба студэнцкіх атрадаў Чэрыкаўскага раённага камітэта БРСМ і атрад імя Віктара Пуганава тэрытарыяльнага штаба студэнцкіх атрадаў Кобрынскай раённай арганізацыі БРСМ.

Найлепшым медыцынскім атрадам стаў «Медык» Гродзенскага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта, найлепшым сэрвісным — «Ратавальнікі» Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Францыска Скарыны, вытворчым — удзельнік маладзёжнага вытворчага працоўнага праекта «Атлант-2021» атрад «БРУклін» з Беларуска-Расійскага ўніверсітэта.

А закрытае акцыянернае таварыства «Атлант» стала найлепшым у намінацыі «Пераходны сцяг найлепшай арганізацыі, якая прымае».

Надзея Шахоўская з задавальненнем адзначае, што сёлета сярод пераможцаў было некалькі атрадаў, куды ўваходзілі не вопытныя старшакурснікі, а падлеткі. Безумоўна, у такім узросце немагчыма трапіць на адзін з самых адказных аб'ектаў — БелАЭС у Астраўцы, таму часцей за ўсё школьнікі задзейнічаны ў сельскагаспадарчых і экалагічных атрадах. Але менавіта там загартоўваюцца будучыя камандзіры і камісары студатрадаў. А ёсць атрады, куды, наадварот, уваходзяць ужо практычна дарослыя людзі — размова ідзе пра педатрады, у якіх летам, падчас свайго водпуску, працуюць ужо выпускнікі педагагічных спецыяльнасцяў — сённяшнія педагогі.

**Карына БАЗАН — камандзір студэнцкага педагагічнага атрада «Новае пакаленне» Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта** (аднаго з пераможцаў конкурсу), расказала, што сёлета была ўжо пятая яе змена ў дзіцячым аздараўленчым лагеры «Арляня».

— Атрад складаўся амаль цалкам з навабранцаў. З мінулага года засталося толькі трое «вопытных байцоў». Таму было вельмі важна, каб яны падтрымалі і развілі нашы студатрадаўскія традыцыі, — канстатавала Карына. — У педатрадах ёсць свая спецыфіка. Тут вельмі важная наяўнасць педагагічнага досведу, якога «маладзі» яшчэ не хапае. Трэба падказваць навічкам, як лепш паступіць у той ці іншай педагагічнай сітуацыі, як размаўляць з дзіцем, каб яно не замкнулася, як выбудоўваюць зносіны з бацькамі выхаванцаў, каб тыя табе давяралі.

— У Карыны вельмі моцны атрад, — заўважае Надзея Шахоўская. — Усе яго ўдзельнікі — яркія асобы. І гэты атрад змог перамагчы не толькі як прафесійны атрад, але і менавіта як студатрад — як калектыў аднадумцаў, дзе ўласныя інтарэсы падпарадкоўваюцца агульным. Бо ў студатрадах фарміруюцца не толькі прафесійныя кампетэнцыі, але і чалавечыя каштоўнасці. Не сакрэт, што моладзь сёння хоча зарабляць, новае пакаленне дастаткова прагматычнае, але студатрад — гэта найперш калектывісцкія каштоўнасці. Я — але ўнутры калектыву... Вельмі важная роля адводзіцца лідарам — камандзірам і камісарам атрадаў. Многае залежыць ад іх здольнасці кіраваць калектывам, вырашаць агульныя праблемы.

**Камісар студэнцкага будаўнічага атрада «Эўрыка» імя Героя Савецкага Саюза Віктара Яронькі Аляксей БАЧКО** (Полацкі дзяржуніверсітэт) — таксама вельмі вопытны маладзёжны лідар. Прызнаецца, што пятая перамога запар у рэспубліканскім конкурсе накладае вялікую адказнасць. А сёлета большасць удзельнікаў атрада былі навічкамі.

— У наш атрад заўсёды быў высокі конкурс. У розныя гады ён дасягаў і шэсць, і нават дзесяць чалавек на месца, — кажа Аляксей. — Гэтым летам мы працавалі ў Астраўцы на БелАЭС мулярамі другога разраду. Сярэдні месячны заробак склаў каля тысячы рублёў. Многія мараць трапіць у «Эўрыку», бо гэта вельмі ганарова. Для таго каб стаць байцом нашага атрада, трэба, па-першае, добра вучыцца і не мець ніякіх «хвастоў» па вучобе. Па-другое, чалавек павінен быць таленавітым ва ўсім. Мы заўсёды вітаем творчых, спартыўных, мэтанакіраваных.

— У нас часта пытаюцца, чаму з году ў год перамагае адзін і той жа атрад? Паверце, што ёсць шэраг крытэрыяў, якімі мы кіруемся, ацэньваючы дзейнасць студатрадаў, — запэўнівае Надзея Шахоўская. — Хлопцы з «Эўрыкі» выконваюць вялікія аб'ёмы работ на адказным аб'екце, прычым яны працуюць не 10 дзён: два месяцы — летам, а таксама і на працягу ўсяго года. Усе валанцёрскія працоўныя акцыі ў краіне праходзяць з іх абавязковым удзелам. Вясной яны ўдзельнічаюць у добраўпарадкаванні памятных мясцін. Зімой — у «Зімовым маршруце». Гэта адна вялікая, моцная і надзейная каманда.

Надзея Шахоўская нагадала, што ў 2023 годзе беларускі студатрадаўскі рух будзе адзначаць сваё 60-годдзе. Першыя студэнцкія атрады выехалі на цаліну ў Казахстан у 1963 годзе. А сёння студатрадаўскі рух з'яўляецца адным з вядучых напрамкаў дзейнасці БРСМ.

*Падчас рэспубліканскага марафону студэнцкіх атрадаў «Маладосць. Праца. Адзінства» была прэзентавана кніга «Наш трэці працоўны» з успамінамі ветэранаў студатрадаўскага руху.* У розныя гістарычныя перыяды яны ўзначальвалі рэспубліканскія, абласныя, занальныя і лінейныя беларускія студэнцкія атрады. Іх успаміны даюць магчымасць адчуць дух часу, геаграфію, напружанасць працы і ўклад байцоў студатрадаў у сацыяльна-эканамічнае развіццё краіны.

«Новае выданне завяршае гістарычную трылогію кніг аб зараджэнні і развіцці студатрадаўскага руху ў краіне. З 2020 года былі выдадзены кніга «Студэнцкія будатрады Беларусі: гісторыя і сучаснасць» і аднайменны фотаальбом. Аўтарскі праект «Наш трэці працоўны» працягвае стварэнне летапісу беларускага студатрадаўскага руху», — адзначыла камандзір штаба. Кніга ілюстравана хранікальнымі фатаграфіямі з Нацыянальнага архіва, Музея гісторыі камсамола і маладзёжнага руху Беларусі, асабістымі фота з архіваў утараў успамінаў.

Адказваючы на пытанне аб планах на найбліжэйшую перспектыву, Надзея Шахоўская расказала, што ў студзені ў другі раз пройдзе патрыятычны працоўны праект «Зімовы маршрут», арганізатарам якога выступае Рэспубліканскі штаб студэнцкіх атрадаў БРСМ пры падтрымцы Міністэрства адукацыі і мясцовых органаў выканаўчай улады. Маладзёжная ініцыятыва арыентавана на прафарыентацыйную работу ў сельскіх школах, адрасную дапамогу пажылым людзям з акцэнтам на грамадзянска-патрыятычны вектар. У студзені 2021 года студэнцкія атрады «Зімовага маршруту» пераадолелі больш як 1,6 тысячы кіламетраў па Віцебскай, Гродзенскай і Магілёўскай абласцях з правядзеннем прафарыентацыйных інтэрактываў і тэматычных заняткаў, канцэртных і сацыяльна значных праграм.

У сакавіку чарговы раз стартуе акцыя «Выбіраем студатрад». Ужо прапрацоўваюцца планы на наступнае лета. У прыватнасці, ёсць задума разгарнуць рэспубліканскі медыцынскі праект у Астраўцы, вытворчыя праекты на МАЗе і МТЗ накшталт праекта на «Атланце».

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
**Фота БРСМ.**

*У ліку найлепшых*

# Родныя пазлы — у надзейных руках



**Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі падвёў вынікі рэспубліканскага патрыятычнага праекта «Ведаю Беларусь», прысвечанага Году народнага адзінства.**

Фінальныя мерапрыемствы — інтэлектуальны турнір «Ведаю Беларусь» і аднаймены фінал рэспубліканскага чэмпіянату па скораснай зборцы спілс-картаў Беларусі — сабралі ў спартыўна-культурным цэнтры Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў тры сотні маладых людзей: пераможцаў адборачных тураў гэтых спаборніцтваў сярод каманд навучэнцаў агульных сярэдніх, сярэдніх спецыяльных і прафесійна-тэхнічных устаноў адукацыі, студэнтаў і працуючай моладзі.

Пераможцам інтэлектуальнага турніру стаў супрацоўнік Міністэрства ўнутраных спраў Яўген Урбан з Мінска. Палепшыць устаноўлены раней камандай школьнікаў Stars з Маладзечна рэкорд у зборцы спіскарты — 3 хвіліны 17 секундаў — не ўдалося нікому. Аднак, нягледзячы на ўскладненыя правілы фінальных гульняў, пераможцы ў чатырох узроставых катэгорыях паказалі дастаткова добры час.

Сярод школьных камандаў пераможцай чэмпіянату з часам 4 хвіліны 20 секундаў стала каманда «Мерыдыян» з Магілёўскай вобласці, сярод спецыяльных і прафесійна-тэхнічных устаноў адукацыі — каманда «Смалявудцы» з Мінскай вобласці. Яе вынік — 4 хвіліны 7 секундаў. У студэнтаў з вынікам 5 хвілін 25 секундаў першай стала каманда «Гномікі» з Віцебскай вобласці. Рэкорд чэмпіянату — 4 хвіліны 1 секунда — устанавіла каманда працуючай моладзі «Жураўлі» з Брэсцкай вобласці. Яна ж перамагла ў сваёй узроставай катэгорыі.

Праект «Ведаю Беларусь» стартаваў 6 верасня пад эгідай БРСМ у супрацоўніцтве з аўтаномнай некамерцыйнай арганізацыяй «Сусветная федэрацыя спілс-картаў» (Расія). Патрыятычная ініцыятыва ўключала трылогію анлайн-квізаў «Беларусь культурная», «Гісторыя Беларусі», «Геаграфія Беларусі», а таксама спаборніцтвы, якія даюць магчымасць у гульнявой інтэрактыўнай форме вывучыць тэрытарыяльнае ўладкаванне рэгіёнаў Беларусі, — адкрытыя чэмпіянаты «Ведаю Беларусь» па скораснай зборцы спілс-картаў краіны. Увогуле ў праекце ўзяло ўдзел больш за пяць тысяч чалавек.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**
**Фота БелТА.**

# КАНСТРУКТАР ЯК СУСВЕТ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

— Экспанаты для музея мы набываем у розных месцах. Новыя экзэмпляры — у рознічным продажы, наборы больш старога выпуску — з рук, а рэдкія і эксклюзіўныя — на аўкцыёнах. Цяпер у нашай калекцыі каля васьмі тысяч экзэмпляраў, і гэта не лічачы самаробных экспанатаў. Наогул, усе яны падзелены па пэўных серыях. Першае, што ўбачыць наведвальнік, прыйшоўшы да нас, гэта выстаўка рэтра-набораў. Мы вельмі ганарымся экспанатамі з гэтага раздзела. Яны самыя старыя, зроблены з дрэва ў 1940-х гадах. А таксама там ёсць самыя першыя наборы LEGO, створаныя ў 1955—1958 гадах. Гэтыя экспанаты было сапраўды складана знайсці. Далей ідуць наборы па розных серыях: у нас у наяўнасці ёсць «Гары Потэр», Lego CITY, Lego Ideas, Lego DS і Marvel, Botanica, Creator, Disney, Lego Friends, Technic і многія іншыя. Для экспанатаў з калекцый Star Wars і Ninjago былі выдзелены асобныя пакоі. Акрамя таго, у нас ёсць два гульнявыя пакоі, дзе кожны наведвальнік незалежна ад узросту можа пагуляць з рэдкімі і вялікімі наборамі.

Надзея прыгадвае, што пры адкрыцці музея іх сям'я сутыкнулася з пэўнымі цяжкасцямі. Галоўнай з іх стаў пошук памяшкання. Асноўнае патрабаванне да яго было — вялікая пляцоўка, бо экспанатаў досыць шмат, зрэшты, як і наведвальнікаў. Цяпер сямейны музей займае чатырыста пяцьдзясят квадратных метраў, але яго арганізатарам гэтага не хапае, і яны ўжо цяпер шукаюцца да дзевяцісця «квадратаў». Апроч згаданай цяжкасці, непрыемным сюрпрызам для нашых герояў стаў каранавірус. З-за эпідэмічнай сітуацыі колькасць гасцей значна знізілася.

— Наш музей LEGO адзіны ў Беларусі. Акрамя таго, мы нават трапілі ў Кнігу рэкордаў Гінеса. Каля паўгода таму падалі заяўку



як уладальнікі самай вялікай калекцыі гэтага канструктара, збіралі розныя доказы, фатаграфавалі ўсе наборы, складалі каталог, а пасля яшчэ і здымалі відэа ўсіх набораў з нумарамі і назвамі. Яно выйшла на сорак гадзін! Але гэта было абсалютна апраўдана. Бо сямнаццатага чэрвеня нам прыйшоў ліст аб тым, што ***мы афіцыйна трапілі ў Кнігу рэкордаў Гінеса як «Самая вялікая прыватная калекцыя LEGO ў свеце»***. На той момант у нас было 5416 экзэмпляраў, ранейшы рэкорд, дарэчы, належаў аўстралійцу.

У завяршэнне наша суразмоўніца згадвае, што музей LEGO — гэта не проста работа мары і сямейнае хобі. Гэта для іх цэлы сусвет, якім яны з радасцю дзеляцца з усімі гасцямі. А мы пажадаем ім удачы ў справе і новых рэкордаў.

**Ангеліна НОВІКАВА.**

*Рука дапамогі*

## «ВАКЦЫНА ДЛЯ ЖЫЦЦЯ»

**Ушанаванне валанцёраў такога праекту адбылося ў БДУ. За арганізацыю тэматычных мерапрыемстваў па пытаннях COVID-19 і вакцынацыі сертыфікаты ўдзельнікаў і памятныя падарункі атрымалі 20 студэнтаў.**

Нагадаем, што асноўнай мэтай праекта было павышэнне адукаванасці моладзі ў пытаннях імунізацыі. Актывісты пярвічнай прафсаюзнай арганізацыі студэнтаў БДУ на працягу лістапада і снежня праводзілі для ўсіх ахвотных тэматычныя стрымы на платформе Zoom і YouTube-канале. Валанцёры ў прамым эфіры расказвалі пра COVID-19, вакцынацыю і рэвакцынацыю, падрыхтоўку да прышчэпкі, правілы гігіены і бяспечныя паводзіны ва ўмовах пандэміі. Таксама ў стрымах у якасці экспертаў выступілі прадстаўнікі БДМУ.

Акрамя таго, падзякі за асабісты ўклад у падрыхтоўку, арганізацыю і правядзенне мерапрыемстваў у рамках праекта «Вакцына для жыцця» ўдастоены прарэктар БДУ па выхаваўчай рабоце і сацыяльных пытаннях Іван Янушэвіч, старшыня і намеснік старшыні пярвічнай прафсаюзнай арганізацыі студэнтаў Вольга Локцева і Дар'я Буткевіч адпаведна. Узнагароды супрацоўнікам БДУ ўручыла галоўны дзяржаўны санітарны ўрач Маскоўскага раёна сталіцы Аксана Башкірава.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

*Лакацыі актыўнасці*

# «Прэс-код» для таленавітых

**Конкурс пад такой назвай для маладых журналістаў абвясцілі БРСМ і Міністэрства інфармацыі. Тэрмін яго правядзення: снежань 2021 года — люты 2022 года.**

Аб старце творчага спаборніцтва абвясціў **старшыня ЦК БРСМ Аляксандр ЛУК'ЯНАЎ** у рамках VIII Форуму маладых журналістаў «Традыцыйныя і новыя медыя: выклікі і магчымасці».

— Конкурс дапаможа праявіць сябе будучым прадстаўнікам сродкаў масавай інфармацыі, будучым прафесійным журналістам, тым, хто сёння актыўна працуе ў сацсетках і асабістых блогах. Ён ахопіць усе рэгіёны і будзе доўжыцца да лютага. Найлепшыя ўдзельнікі змогуць ўвайсці ў калектывы перадавых СМІ краіны, — расказаў Аляксандр Лук'янаў. — Інфармацыя аб умовах конкурсу размешчана на сайтах БРСМ і Міністэрства інфармацыі.

У творчым спаборніцтве могуць узяць удзел маладыя людзі ва ўзросце ад 16 да 31 года, якія з'яўляюцца грамадзянамі Рэспублікі Беларусь. Узроставыя групы ўдзельнікаў конкурсу:

— група 1 — ад 16 да 21 года ўключна (на момант накіравання заяўкі);

— група 2 — ад 22 да 31 года ўключна (на момант накіравання заяўкі).

Да ўдзелу ў конкурсе не дапускаюцца калектыўныя і/або ананімныя работы, якія не змяшчаюць інфармацыю аб удзельніку творчага спаборніцтва.



Конкурс будзе праходзіць у два этапы.

**Першы этап** (абласны) — праводзіцца абласнымі камітэтамі ГА «БРСМ» ва ўзаемадзеянні з абласнымі выканаўчымі камітэтамі і рабочай групай конкурсу ў перыяд да 28 студзеня 2022 года.

Пасля падвядзення вынікаў першага этапу конкурсу пераможцы, а таксама намінанты (не больш за дзесяць работ ад рэгіёна) бяруць удзел у другім этапе. Па выніках правядзення абласнога этапу вызначаюцца пераможцы ў кожнай намінацыі і кожнай узроставай групе, якія ўзнагароджваюцца спецыяльнымі дыпломамі.

**Другі этап** (рэспубліканскі) — праходзіць з 1 да 18 лютага 2022 года і з'яўляецца заключным.

Творчае спаборніцтва праводзіцца па наступных намінацыях:

I. Катэгорыя друкаваных СМІ: «Найлепшыя аўтарскія матэрыялы» (рэпартаж, спецыяльны праект патрыятычнай тэматыкі); «Найлепшая карыкатура па найбольш вострай сацыяльнай тэматыцы»; «Найлепшы фотарэпартаж»;

II. Катэгорыя электронных СМІ і інтэрнэт-рэсурсаў: «Найлепшы відэасюжэт аб памятных мясцінах Беларусі, вядомых людзях, знамянальнай падзеі»; «Найлепшы відэаблог»; «Найлепшая аператарская работа»; «Найлепшы праект у новых медыя».

Матэрыялы з пазнакай «На конкурс» накіроўваюцца не пазней за 28 студзеня 2022 года на электронны адрас konkurszhurnalistov@yandex.by.

Пераможцамі прызнаюцца ўдзельнікі, якія прадставілі конкурсныя матэрыялы, што адпавядаюць наступным крытэрыям: актуальнасць і грамадская значнасць тэмы; глыбіня асвятлення; арыгінальнасць яе распрацоўкі; аргументаванасць заяўленых у матэрыялах пазіцый; стылістыка і моўныя сродкі (публіцыстычныя работы); мастацкая кампазіцыя, якасць выканання (відэаработы).

Журы вызначае пераможцаў конкурсу, якія ўзнагароджваюцца дыпломамі арганізатараў, а таксама каштоўнымі падарункамі ад рэдакцый вядучых рэспубліканскіх СМІ. Інфармацыя аб выніках і пераможцах, даце і месцы правядзення ўрачыстай цырымоніі ўзнагароджання размяшчаецца ў СМІ і на афіцыйных сайтах Міністэрства інфармацыі (www.mininform.gov.by) і ГА «БРСМ» (www.brsm.by).

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

*Новыя старты*

## За «Дасягненне» — і ўзнагарода

**Першая абласная маладзёжная прэмія пад такой назвай адбылася ў Віцебску. Мерапрыемства сабрала найлепшых маладых людзей вобласці, якія сваімі дасягненнямі ў розных сферах дзейнасці заявілі аб сабе ў 2021 годзе.**

Пераможцы вызначаліся ў наступных намінацыях: «АдзінствVO», «Герой нашага часу», «ПрацаVO», «ДаброVO», «СпортVO», «МедыяVO», «ДасягненнеVO». Уручалі ўзнагароды пераможцам у кожнай намінацыі ганаровыя госці мерапрыемства — кіраўніцтва Віцебскай вобласці, заслужаныя майстры сваёй справы, прадстаўнікі медыяпрасторы.

— Абласная маладзёжная прэмія «Дасягненне» — гэта ўнікальная магчымасць заахвоціць маладых грамадзян, маладзёжныя грамадскія аб'яднанні, іншыя арганізацыі і калектывы, якія праявілі сябе ў грамадзянска-патрыятычным выхаванні моладзі, студатрадаўскім і валанцёрскім руху, грамадскай рабоце, — пракаментаваў падзею **першы сакратар Віцебскага АК ГА «БРСМ» Уладзімір БАБІЧАЎ**.

Прэмія праводзіцца з мэтай выяўлення, падтрымкі і заахвочвання ініцыятыў і дасягненняў таленавітай моладзі, маладзёжных лідараў у сацыяльна-эканамічным і грамадска-палітычным жыцці краіны.

Арганізатарам Прэміі з'яўляецца Віцебскі абласны камітэт Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі пры падтрымцы дзяржаўных і прыватных структур, грамадскіх і творчых арганізацый, сродкаў масавай інфармацыі.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

*Знайсці сябе*

# І ГРЫБЫ АКАЗАЛІСЯ... «ЗАЛАТЫМІ»!



**Вучаніца 10 класа Асіповіцкай СШ № 3 Марыя Серабракова ўзяла «золата» XVIII Міжнароднага юніёрскага лясного конкурсу, які праходзіў дыстанцыйна. У фінале ўдзельнічалі 25 канкурсантаў з Еўропы, Азіі, Афрыкі, Паўднёвай і Паўночнай Амерыкі.**

16-гадовая Марыя — пераможца рэспубліканскага злёту юных лесаводаў і юных эколагаў, міжнароднага форуму студэнцкай і навучэнскай моладзі «Першы крок у навуку — 2021», прызёр рэспубліканскага этапу юніёрскага лясного конкурсу «Квітней, мой лес».

Тэма яе навукова-даследчай работы — «Мікалагічны маніторынг лясных экасістэм і апрабацыя методык павышэння ўраджайнасці грибных мясцін». Дзяўчына вывучала, як можна павялічыць ураджайнасць белых грыбоў у лясах, а таксама вырошчванне вешанак на прыватных падворках. На працягу пяці гадоў Марыя адпрацоўвала на практыцы на ўзлесках свой метад павелічэння росту ўраджайнасці грыбоў. А грыбы-вешанкі вырошчвала на прыватным падворку ў іншай школьніцы — васьмікласніцы Арыны Барадаўкі, якая з'яўляецца суаўтарам школьнай даследчай работы.

Два другія месцы журы прысудзіла работам юніёраў з Аўстрыі і Бразіліі. Трэція месцы — у прадстаўнікоў Расіі і Кітая.

Міжнародны юніёрскі лясны конкурс праводзіцца па ініцыятыве Федэральнага агенцтва лясной гаспадаркі (Расійская Федэрацыя) з 2004 года ў мэтах прыцягнення ўвагі маладога пакалення да пытанняў экалогіі, умацавання статусу і папулярызацыі лесаводчых прафесій сярод моладзі.

Конкурс накіраваны на набыццё юнымі лесаводамі дадатковых ведаў у галіне экалогіі і лясной гаспадаркі, а таксама на азнаямленне з актуальнымі праблемамі і перспектывамі развіцця лясной гаспадаркі ў свеце.

Штогод у мерапрыемстве бяруць удзел дзясяткі школьнікаў і студэнтаў з краін Азіі, Афрыкі, Еўропы, Паўночнай і Паўднёвай Амерыкі. Удзельнікі конкурсу — школьнікі і студэнты ва ўзросце ад 14 да 22 гадоў, якія ажыццяўляюць навукова-практычныя праекты ў галіне лесаводства і аховы навакольнага асяроддзя.

За 17 гадоў свайго існавання конкурс праходзіў у Маскве і Маскоўскай вобласці, Санкт-Пецярбургу, Пецяргофе, Варонежы, Суздалі і Ханты-Мансійску.

Беларусь з'яўляецца пастаянным удзельнікам Міжнароднага юніёрскага лясного конкурсу. У скарбонцы беларускіх прадстаўнікоў — прызавыя месцы, дыпломы за найлепшыя дасягненні, а таксама за актыўны ўдзел у конкурсе.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
**Фота з сайта edu.gov.by**

SEX-БАЛЯСЫ

# Ню давай!

**У любым становішчы — раздзявайся! Помніцца, у сваіх колішніх нататках я ўжо выкарыстоўваў падобную фразу... Аднак жыццё толькі пацвярджае, што для многіх яна па-ранейшаму не страчвае сваёй актуальнасці. («Я тая самая жанчына, якая не дае свайму метабалізму расслабіцца. Ён ніколі не ведае, што яго чакае — галадоўка ці кілаграм пельменяў у дзве гадзіны ночы».) Якое там становішча — прадказальнае або незвычайнае — не ў тым справа. («Я б на многае дзеля цябе пайшла, каханы. Але мне няма ў чым...») Трэба, не трэба — адзенне прэч, даеш ню! Часам гэта можа прыводзіць да самых нечаканых сітуацый. («Прайграла мужу ў карты на жаданне. Хто ж мог падумаць, што ён такі вычварэнец?! Прымусіў мяне з'ехаць да маці на тыдзень!»)**

Напрыклад, чытаеш матэрыялы пра Вольгу Бузаву — ну быццам бы найразумнейшы ж чалавек! Не-не-не, я не фанат, усё выключна па «доўгу службы»! Хоць сама гераіня любіць паўтараць, што калі некаму патрэбны хайп, трэба напісаць пра яе. Выходзіць, далучаюся? («Мяне часта папракаюць у тым, што я жыву, як душа жадае. Прабачце, а як чыя душа жадае, я павінен жыць?») Але ў жыцці «зорка» любіць як душэўны (адыграла ў тэатральнай пастаноўцы, была звольненая, потым пагражала судовым іскам за тое), так і цялесны стрыптыз. («Не, я, вядома, знайду выхад з любой сітуацыі. Здзіўляе іншае: як я знаходжу туды ўваход?») Неяк Бузава стала пераможцай у намінацыі «Ікона стылю» на адной з модных цырымоній, куды з'явілася ў адкрытай сукенцы з дэкальтэ, вялікімі выразамі на таліі, спіне і сцягне. Фанаты нават прапанавалі «зорцы» тады ўжо зусім раздзецца. «А сукенка ж дзе? Я бачу толькі бюстгальтар і прышпіленую да яго занавеску», «І гэта сукенка іконы стылю?» («Не будзіце ўва мне сцерву, яна і так, бедная, не высыпаецца»). Ну, сапраўды — які стыль, такая і «ікона»...

А вось крыху іншая гісторыя. Бяздомная брытанка, маці-адзіночка, усяго за год зарабіла больш за мільён фунтаў стэрлінгаў з дапамогай сэрвісу OnlyFans на продажы інтымных здымкаў. («Ён: — Што на табе зараз? Яна: — Іпатэка, тры крэдыты, трошачкі даўгоў, некалькі мікракрэдытаў і растэрміноўка».) Жыхарка брытанскага Нотынгема ўсяго за такі адносна невялікі тэрмін ператварылася ў паспяховую мадэль-мільянера. Пра гісторыю ўзбагачэння Авы Грэйс расказала выданне The Sun. («Ты павінна! Забівае гэтая фраза... Тое, што я павінна, запісана ў падатковым кодэксе, тое, што не павінна, — у крымінальным... Астатняе — на мой погляд!!!») Як удалося высветліць журналістам, яшчэ год таму жанчына жыла са сваёй пяцігадовай дачкой практычна на вуліцы. Аднак у нейкі момант 29-гадовай англічанцы прыйшла ў галаву думка паспрабаваць зарабіць на продажы сваіх «гарачых» здымкаў.



Аказалася, што наведвальнікі рэсурсу не проста гатовыя плаціць Грэйс, яна яшчэ і вымушана (?!) працаваць па 18 гадзін у суткі, каб не расчароўваць падпісчыкаў. («Ніколі не раздзявайце дзяўчат хутка. Яны могуць не паспець уцягнуць жывот».) Уяўляеце?! Як бедненькай дастаецца?! Хоць якая яна бедненькая, цяпер ужо ўсё наадварот. Гэтая «нагрузка» добра акупляецца. («Карпаратыў удаўся — гэта калі працоўную кніжку табе прывозяць проста дадому».) «Продаж пікантных фота ў інтэрнэце цалкам змяніў маё жыццё, — сказала Грэйс. — З 16 гадоў я фактычна была бяздомнай. Мне было цяжка і заўсёды даводзілася змагацца. («Фіма, калі вам такі няма чаго кінуць да ног жанчыны, то я вас малю: хоць самі там не блытайцеся!») У мяне не было знаёмых, на якіх я магла б разлічваць, і ніколі не было сям'і...» І тут такі паварот! («На вяселлі сяброўку Таня пабегла лавіць букет, потым ачомалася і вярнулася. Бачылі б вы вочы яе мужа!») Грэйс змагла купіць сабе дом за 250 тысяч фунтаў стэрлінгаў і патраціць яшчэ 15 тысяч на шыкоўны водпуск. Яна афіцыйна з'яўляецца адной з 300 чалавек на планеце, якія змаглі стаць мільянерамі дзякуючы OnlyFans. Ну, у дадзенай гісторыі агаленне хоць бы зрабіла чалавека багатым. Для колішняй бяздомнай гэта нейкае апраўданне. Чаго не скажаш пра іншыя выпадкі.

Так, порнаактрысу Рыту Фокс арыштавалі на 14 сутак з-за фота з... голымі ягадзіцамі на фоне Крамля. Публікуючы здымак, яна разумела, што яе могуць прыцягнуць да адміністрацыйнай адказнасці. («Ведаеце, як лёгка раз'юшыць дзяўчыну? Сфоткайце яе і не паказвайце здымак!») Цвярскі суд Масквы прызнаў вінаватай Ксенію Дамаву, вядомую як Рыта Фокс, у дробным хуліганстве. («— Чаму ты назваў Машу шалёна прыгожай? — Дык яна сапраўды прыгожая! І шалёная...») Згодна са скрынамі, апублікаванымі ў тэлеграм-канале Дамавай, тая разумела, што здымак можа стаць падставай для арышту. Па яе словах, пасля агалоскі ў медыя яна зразумела, што «давыпендрывалася». («— Што перашкаджае вам быць самімі сабой? — Правілы этыкету і крымінальны кодэкс».)

Дагэтуль суд у Расіі прысудзіў блогераў да дзесяці месяцаў калоніі за фатаграфію з інтымным падтэкстам на фоне храма Васілія Блажэннага. Іх прызналі вінаватымі ў знявазе пачуццяў вернікаў. Гэта чым жа трэба было тым блогерам думаць? «Тым самым» месцам?

...Чым бы ўсё хацелася скончыць? Вядома, анекдотам. («— Давай трымаць паміж намі сацыяльную бездань? — Ты хацеў сказаць «сацыяльную дыстанцыю»? — Не...»)

**Кастусь ХАЦЕЛАЎ-ЗМАГЕЛАЎ.**

# «Траўмы — гэта рабочыя моманты»

***— А ўвогуле як ты пачаў займацца барацьбой?***

— Мой тата любіць спорт, і ён браў мяне з братам у спартыўную залу. Там мы не вельмі сур'ёзна займаліся, скакалі, бегалі, больш нават свавольнічалі. І аднойчы зусім выпадкова трэнер па барацьбе ўбачыў, як я куляюся, раблю кульбіты. Я нічога пра гэта не ведаў, само ўсё атрымлівалася. Трэнеру спадабаліся мае акрабатычныя здольнасці, і ён прапанаваў прыйсці ў яго секцыю. І там я захапіўся барацьбой. У маім Маладзечне няма секцый па вольнай барацьбе, толькі грэка-рымская. Таму асаблівага выбару ў мяне не было. Часам хочацца пабароцца як «вольнік». Але мне ўжо не варта гэтага рабіць, змена стылю можа выбіць з каляіны. Але можам з хлопцамі дзеля забаўкі пабароцца вольным стылем.

**«Мне не страшна пераходзіць на дарослы ўзровень. Я ўжо ўдзельнічаў у такіх турнірах, займаў прызавыя месцы. Псіхалагічна я гатовы. Думаю, усё будзе нармальна».**

***— Калі ты зразумеў, што барацьба можа стаць тваім асноўным заняткам?***

— Недзе праз паўгода пасля пачатку я вырашыў, што хачу пастаянна займацца ёю. Трэнер нам казаў, што галоўная задача — гэта Алімпійскія гульні. Але я ў дзяцінстве нічога пра гэта не ведаў. Я нават думаў, што калі вырасту, мне ж прыйдзецца працаваць, разважаў, як я буду і гэта рабіць, і спортам займацца. Вельмі хацеў трэніравацца, выступаць на спаборніцтвах. А калі даведаўся, што спорт можа быць прафесіяй, то быў вельмі шчаслівы.

***— На твой выбар паўплывалі куміры ў свеце барацьбы?***

— У мяне іх няма. Ёсць спартсмены, чый стыль падабаецца. Нават не замежныя барцы, а з нашай каманды. Калі ўзяць, напрыклад, кідкі, мне імпануе, як іх робіць Кірыл Маскевіч, падабаецца яго барацьба. Нават асабліва вылучаць нікога не хачу, бо шмат добрых спартсменаў.

**«Мне здаецца, у жыцці цяжка знайсці чалавека, у якім можна быць упэўненым ва ўсіх сітуацыях. У барацьбе знайсці такога можна».**

***— Павел, лічыцца што барацьба — вельмі дружны спорт, нягледзячы на пастаяннае змаганне ў прамым і пераносным сэнсе слоў. Гэта так?***



— Абсалютна так. Мне здаецца, у жыцці цяжка знайсці чалавека, у якім можна быць упэўненым ва ўсіх сітуацыях. У барацьбе знайсці такога можна. У нас вельмі дружны калектыў. Напрыклад, Мікалай Стадуб перайшоў у маю катэгорыю. Ён мой будучы сапернік, на 10 гадоў старэйшы, ён фаварыт у нашай катэгорыі, але ў нас вельмі добрыя адносіны. Калі ў мяне нешта не атрымліваецца, магу да яго звярнуцца па параду. Трэнеры выхоўваюць нас так, каб мы трымаліся разам, былі камандай. Мне пашанцавала: з самага дзяцінства і на працягу ўсёй спартыўнай кар'еры побач са мной быў вельмі добры калектыў. Мой першы трэнер Антон Найлавец многаму мяне навучыў, казаў мне правільныя рэчы, карысныя не толькі для спорту, але і для жыцця. Міхаіл Упеньек і Мікалай Амбражэвіч, з якімі я зараз працую, таксама вельмі многа мне даюць.

**«Я люблю рабіць кідкі і не люблю штурхацца. Хачу адразу выціснуць максімум ад схваткі».**

***— Усяму свету вядома гісторыя, як барэц грэка-рымскага стылю выступаў з адарванай грудной мышцай. У тваёй кар'еры былі выпадкі, калі прыходзілася выступаць з траўмамі?***

— Выступаў з траўмаванымі каленямі, галенастопамі. У гэтым няма нічога такога. Барацьба — наша работа і мы павінны рабіць сваю справу ў любым стане. Гэта, можна сказаць, наш доўг. Траўмы здараюцца з усімі спартсменамі, гэта рабочыя моманты. Хоць вушы, як многія іншыя барцы, я ніколі не ламаў. Мне, дарэчы, здаецца, што большасць людзей пра барацьбу ведае толькі праз такі момант. Таму трэба папулярызаваць наш від спорту, каб людзі разумелі, што барацьба — гэта значна цікавей, чым гэтая акалічнасць.

***— У барацьбе вялікае значэнне мае вага. Як ты падтрымліваеш сваю, часта прыходзіцца як «ганяць»?***

— У мяне з гэтым праблем няма. Я выступаю ў катэгорыі 97 кілаграмаў, а важу недзе 96. Таму часам, калі ўсе стараюцца скінуць, мне трэба набіраць. З аднаго боку, гэта добра. А з іншага — я б лепей скінуў некалькі кілаграмаў, так прасцей трымаць сябе ў тонусе. Я заўважыў, калі пазбаўляюся ад іх, адчуваю сябе лепш. У дзяцінстве былі праблемы, часта «ганяў» па 5—7 кіло. Апошняя згонка была ў 2018 годзе перад чэмпіянатам свету сярод «кадэтаў», я тады 8 кілаграмаў скінуў. Згонка вагі — вельмі непрыемны працэс. Пасля я пераскочыў дзве катэгорыі і бароўся ўжо «свежанькім».

**«Трэнеру спадабаліся мае акрабатычныя здольнасці, і ён прапанаваў прыйсці ў яго секцыю. І там я захапіўся барацьбой».**

***— Павел, ты сказаў, што трэба папулярызаваць барацьбу. А навошта маладым людзям займацца гэтым спортам?***

— На сваім прыкладзе магу сказаць, што ён накіроўвае чалавека ў правільнае рэчышча. Барацьба прывівае мэтанакіраванасць, развівае характар. Любы від спорту абавязкова засцеражэ ад дрэнных кампаній, звычак. Таму кожнаму варта хадзіць у спартыўныя секцыі, хоць бы да паўналецця.

***— У чым сакрэт тваёй спартыўнай матывацыі?***

— Я сам хлопец хоць і мэтанакіраваны, ды летуценны. Жыву і пастаянна бачу перад сабой свой вынік на самых галоўных стартах. Уяўляю сваё выступленне, як радуюся поспеху. Дня не праходзіць, каб я аб гэтым не думаў. Вось такая ў мяне матывацыя.

**Валерыя СЦЯЦКО.**
**Фота з архіва героя.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

ЧЫРВОНКА. Чырвоная змена
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 12
ад 19 лютага 2009 года выдадзена
Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі газеты —
рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»,
грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».
Дырэктар — галоўны рэдактар
КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

Адказныя за выпуск: рэдактар аддзела
Надзея НІКАЛАЕВА, рэдактар аддзела Сяргей РАСОЛЬКА.
Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
Адрас рэдакцыі: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.
Кантактныя тэлефоны: 292 44 12, 311 17 41.
e-mail: info@zviazda.by
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве
«Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
ЛД №02330/0494179 ад 03.04.2009.
220013, г. Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1.
Тыраж 14.804.
Нумар падпісаны ў 19.30 22.12.2021 г.

# Кулінарныя сімвалы зімовага свята

## Мандарыны і «Аліўе»: параўноўваем цэны з мінулым годам

**У апошнія тыдні перад Новым годам прынята падводзіць вынікі і прыводзіць разнастайныя лічбы. Наша рубрыка вырашыла не заставацца ўбаку ад пераднавагодняга мэйнстрыму. Самы час палічыць, у якую суму сёлета ў параўнанні з мінулым годам спажыўцу абыдуцца галоўныя стравы навагодняга стала — мандарыны і салата «Аліўе», без якіх немагчыма ўявіць навагоднае застолле.**



### ВОДАР СВЯТА

Самыя даступныя «зімовыя вітаміны» ў нашых шыротах — цытрусавыя, а самыя навагоднія цытрусавыя — мандарыны. Можна сказаць, гэта ўжо традыцыя, асвечаная калі не стагоддзямі, то, прынамсі, дзесяцігоддзямі. Якія асацыяцыі ў вас выклікае водар мандарынаў? Як правіла, адказы будуць падобнымі: Новы год, пераднавагоднія дні і навагодняе застолле. З мандарынаў і пачнём...

Апроч трывалага асацыятыўнага шэрагу «пах і смак мандарынаў — Новы год», у гэтых цытрусавых яшчэ мноства плюсаў: усяго 40 ккал у 100 грамах (плюс клятчатка, якая паскарае пахудзенне), велізарная колькасць вітамінаў (не толькі С, але і А, D, K і $B_{12}$), прыродныя антысептыкі фітанцыды. Апошнія падтрымліваюць імунітэт і абараняюць ад бактэрый і вірусаў. Вітамін $B_{12}$ скарачае выпадзенне валасоў і паскарае іх рост, вітамін А паляпшае зрок і работу кішэчніка. Вітамінны «кактэйль», які змяшчаецца ў мандарынах, падаўляе выпрацоўку гармону стрэсу карцізолу, і гэта выдатна адбіваецца на настроі.



Сёлета, як і ў папярэднія гады, мандарыны прадстаўлены на рынках і ў гіпермаркетах у пераднавагоднія дні ў шырокім асартыменце. У асноўным на дадзены момант беларускаму спажыўцу даступныя іспанскія (самыя салодкія), абхазскія (кісла-салодкія без костачак), мараканскія з савецкага дзяцінства (з такімі чорнымі ромбікамі-налепкамі — памятаеце?) і іспанскія клеменціны. На рынку мандарыны на шматлікіх латках можна пакаштаваць (у краме, зразумела, не), так што ідзём на рынак.

На Камароўцы ў сувязі з халадамі гародніна-садавіна з адкрытага рынку перамясцілася ў закрыты павільён.

— Іспанскія мандарыны, мабыць, самыя аранжавыя, — тлумачыць прадавец Святлана. Яна кажа, што мандарыны раскупляюцца добра — яны ў пераднавагоднія тыдні і робяць касу. ***Іспанскія мандарыны*** салодкія, з лёгкай кіслінкай. Пазнаць іх можна па зялёнай галінцы амаль на кожнай мандарынцы — так гэтыя цытрусавыя лепш захоўваюцца. Абіраюцца яны лёгка, але костачак зашмат, калі хто не любіць. Прадаюць «сонечнае прывітанне з Іспаніі» па 5, 5,50 і 6 рублёў. Шмат костачак звычайна і ў турэцкіх мандарынах. Яны таксама салодкія, тлумачыць суразмоўніца, але абіраюцца турэцкія не вельмі лёгка: скурка тонкая і прыліпае да мякаці. Турэцкія мандарыны спеюць з кастрычніка да студзеня, але сёлета на рынку іх амаль няма, кажуць прадаўцы (мне не трапіліся).

У ***абхазскіх мандарынах***, растлумачылі мне, костачкі можна сустрэць вельмі рэдка. І абіраюцца яны лёгка. На смак адчуваецца выразная кіслінка. Лупіна можа быць нават зялёнай, але гэта не значыць, што мандарын няспелы.

**Вітамінны «кактэйль», які змяшчаецца ў мандарынах, падаўляе выпрацоўку гармону стрэсу карцізолу, і гэта выдатна адбіваецца на настроі.**

— У гэтым годзе абхазскіх мандарынаў мала, а ў мінулым наогул не было: неўраджай. А іх многія пытаюцца, ёсць аматары менавіта абхазскіх, — расказвае прадавец.

Прадаюць абхазскія мандарыны па 3,50-4 рублі за кілаграм.

***Мараканскія мандарыны*** не расчароўваюць і ўспаміны дзяцінства не псуюць. Хоць прадаўцы тлумачаць, што ўраджай мандарынаў у далёкім Марока сёлета таксама не занадта атрымаўся: так сабе прыехалі мандарыны, бледнаватыя і не такія салодкія, як звычайна. Але я, як няспешчаны сонечнай садавінай паўночны жыхар, «некандыцыі» не заўважыла — па мне, дык тое што трэба! І абіраюцца лёгка, і лупіна яркага аранжавага колеру, і на смак салодкія з далікатнай кіслінкай, і без костачак зусім.

— Іх можна адрозніць па злёгку пляскатай форме: пасярэдзіне заўсёды ёсць увагнутасць, — тлумачыць Святлана.

Каштуюць мараканскія мандарыны 5 рублёў за кілаграм.

***Італьянскія мандарыны*** — таксама ўдалы выбар, расказалі мне. Яны яркія, салодкія, скурка тонкая і лёгка чысціцца, мякаць шчыльная і сакавітая. Прадаюць іх па цане ад 5 да 7 рублёў за кілаграм — у залежнасці ад дыяметра.

***Клеменціны*** — не мандарыны (хоць вельмі падобныя), а гібрыд: вынік скрыжавання мандарына з апельсінам-«каральком». З мінусаў — абіраюцца крыху горш за мандарыны, маюць шчыльную скурку і зашмат костачак, на долькі падзяляюцца не так лёгка, як мандарыны. З плюсаў — салодкія і вельмі сакавітыя. Прыгожы яркі колер. Плюс апошнім часам іх прадаюць з лісточкамі зверху — гэта выглядае на святочным стале вельмі дэкаратыўна. Клеменціны прапаноўваюцца іспанскія і італьянскія: ад 5,50 рублі да 7,50 рублёў за кіло.

У мінулым годзе перад Новым годам на Камароўцы цана на мандарыны (і клеменціны) вар'іравалася ад 3,50 да 5,50 рублёў. У продажы былі турэцкія мандарыны, а абхазскіх не было (неўраджай). Іспанскія і італьянскія мандарыны мінулай зімой каштавалі каля 5,50-6 рублёў за кілаграм. Так што цэны на «аранжавы настрой» за год не нашмат падраслі па некаторых пазіцыях: з 3,50-6 рублёў да 3,50-7,50.

Што можна зрабіць з мандарынамі, акрамя як з'есці іх ці ўпрыгожыць імі ёлку (асабліва дарэчы такі дэкор будзе ў год Тыгра, калі «тыгрыныя колеры» вітаюцца)? Напрыклад, пачаставаць хатніх далікатным навагоднім дэсертам.

***НАМ СПАТРЭБЯЦЦА:** жэлацін (10 г для першага слою + 5 г для другога), вяршкі 20 % (400 мл), цукар па смаку і свежавыціснуты сок 5 мандарынаў.*

***Жэлацін (10 г) заліваем 50 мл вады, даём яму набрыняць. У сацейніку разаграваем вяршкі з цукрам, дадаём набрынялы жэлацін, змешваем з дапамогай блэндара, заліваем у крэманкі і ставім у халадзільнік да застывання. Тым часам гатуем другі слой. 5 г жэлаціну размешваем у 2 ст. л. вады і расплаўляем у мікрахвалеўцы, дадаём яго ў сок мандарына, старанна змешваем, заліваем другі пласт і зноў адпраўляем у халадзільнік, каб ён застыў. Прыемнага апетыту!***

***«АЛІЎЕ» КЛАСІЧНАЯ***

***Вараная каўбаса (у арыгінале — «Доктарская») — 400 г;***
***5 адварных бульбін сярэдняга памеру;***
***2 невялікія адварныя морквы;***
***5 вараных укрутую яек;***
***4 салёныя (або марынаваныя) агуркі;***
***1 сярэдняя галоўка рэпчатай цыбулі;***
***1 слоік зялёнага гарошку;***
***маянэз.***

### ЯЕ ВЯЛІКАСЦЬ «АЛІЎЕ»

Без «Аліўе», як мы ўжо казалі, навагодні стол немагчымы, бо гэта традыцыя. На Новы год гэтую салату гатуюць і тыя, хто прынцыпова есць каўбасу і маянэз кожны дзень у піку прыхільнікам здаровага харчавання (гэтыя — у класічнай савецкай версіі), і адэпты ЗЛЖ — з ёгуртам замест маянэзу і курынай грудкай замест «Доктарскай». Але ўсё ж і такая «Аліўе» — не менш важны «персанаж» святочнай ночы, чым упрыгожаная ёлка і шампанскае апоўначы.

Палічым кошт класічнага савецкага рэцэпта (таго самага, які ва ўсім свеце завуць «Рускім», salade a la Russe). На Новы год яго і сёння гатуюць у большасці сем'яў. Яго рэцэпт, напэўна, вядомы вам, нават калі нічога больш складанага за пельмені з крамы вы зроду не гатавалі.

